КУЛЬТУРА ▸ ГРАМАДСТВА ▸ ЭКАНОМІКА ▸
ЛЮДЗІ ▸ ПАДЗЕІ ▸ ФАКТЫ

◂ № 9 (185)
◂ 12 САКАВІКА ◂ 2010 г.
www.novychas.org

# Новы Час



**АЛЯКСАНДР КАМАРОЎСКІ**

Стар. 4

**АПАЛІТЫЧНЫ СІНДРОМ**

Скончыўся тэрмін вылучэння прэтэндэнтаў ва ўчастковыя выбарчыя камісіі па выбарах у мясцовыя саветы дэпутатаў

Стар. 5

**МЕГАЗОРКА З БЕЛАГА ДОМУ**

Мішэль Абама знайшла сваё месца ў народнай палітычнай культуры

Стар. 13

**ДАЧКА ВІТАЎТА**

Стар. 15

**ЧЫТАЙЦЕ Ў НАСТУПНЫМ НУМАРЫ!**

**ТРАГЕДЫЯ ГАІЦІ**

Рэпартаж нашага карэспандэнта Алега Новікава

▸ З НАГОДЫ

# СІЗІФАВА ПРАЦА?




Фота Юрыя Дзядзінкіна

Акцыя пратэста супраць указа № 760. Мінск, 21 студзеня 2008 г. Архіў

Вольга ХВОІН

**Любяць беларускія чыноўнікі ствараць сабе ды жыхарам сінявокай праблемы. А пасля іх герaічна сумесна пераадольваць. На пачатку сакавіка з'явілася інфармацыя, што індывідуальным прадпрымальнікам сёлета могуць вярнуць права прыцягваць наёмных працаўнікоў, якія не з'яўляюцца членамі іх сям'і або блізкімі сваякамі.**

Адпаведны пункт ужо ўключаны Міністэрствам эканомікі ў план лібералізацыі на 2010 год, які зараз актыўна абмяркоўваецца ўрадам і бізнес-супольнасцю. Аднак тады для чаго трэба было намотваць нервы на кулак у 2007–2008 гадах?

Тады па краіне пракацілася хваля вулічных акцый пратэсту ІП супраць 760-га Указу кіраўніка дзяржавы, які абмяжоўваў у тым ліку і колькасць наёмных работнікаў у дробных прадпрымальнікаў. Між іншым, з-за тых акцый пратэсту было асуджана па крымінальных артыкулах больш за дзесяць чалавек. Людзям паламалі жыццё, папсавалі здароўе, бізнес. А цяпер такі рэверанс: маўляў, памыліліся, сітуацыя вымагае вяртання на старыя колы. Не па сваёй волі чыноўнікі пайшлі на саступкі — эканамічны крызіс выявіўся значна больш дзейсным аргументам за меркаванне тысяч беларусаў. Патрэбна ажыўляць эканоміку, плаціць заробкі, змагацца з беспрацоўем — вось і прагнуліся. Але ж ці надоўга?

Яшчэ ў снежні мінулага года прадпрымальнікі даслалі кіраўніку дзяржавы і ўраду зварот з просьбай разгледзець магчымасць адмены ІП з 1 студзеня 2010 года ўсіх абмежаванняў па найму працаўнікоў. І вось Мінэканомікі абвясціла, што гатовае падтрымаць гэту ідэю, і нават уключыла яе ў план лібералізацыі. Але чакаецца, што права прыцягваць да ажыццяўлення прадпрымальніцкай дзейнасці трох наёмных працаўнікоў будзе прадстаўлена прадпрымальнікам толькі на перыяд да 31 снежня 2012 года. Магчыма, на той час у краіне будуць абсалютна іншыя ўмовы і бізнес-клімат, і праблемы з наймам работнікаў ІП мець не будуць. Але сёння ніхто нічога гарантаваць не можа. Дык як не прыгадаць народную мудрасць пра турму ды суму — у Беларусі заракацца ад гэтага як мінімум наіўна.

Але ці насамрэч гэты метад дзейсны ды выведзе дробны бізнес на грэбень эканамічнай хвалі? Не — гавораць эксперты. Бо лечыцца не сама хвароба, а яе наступствы. «Калі б падатковая сістэма і агульныя ўмовы працы прадпрымальніцкай дзейнасці ў краіне былі больш лёгкімі, то не было б сэнсу ўводзіць абмежаванні па колькасці наёмных работнікаў.

Менавіта такім чынам урад хацеў вывесці дробны бізнес з ценю ды павялічыць грашовыя паступленні ў бюджэт, — лічыць Аляксей Абражэй — эксперт юрыдычнай кампаніі «Прававы паверанны». — У адэкватных, спрыяльных умовах прадпрымальнік сам бы вырашаў, патрэбнае яму ІП ці лепш зарэгістраваць юрыдычную фірму і выплачваць адпаведныя падаткі. Знікла б сама прычына канфлікту. Але атрымліваецца, што дзяржава ўвесь час спрабуе вырашыць пытанне збору падаткаў праз скарачэнне актыўнасці прадпрымальніцтва, а не праз выкараненне праблем, якія мае бізнес. Гэта паказвае, што ў кіруючых вярхах у прынцыпе няма падыходу да рашэння праблемы індывідуальных прадпрымальнікаў».

Да слова, па некаторых ацэнках, сектар дробнага бізнесу пасля ўвядзення абмежавання па найму работнікаў страціў за апошнія два гады каля ста тысяч працоўных месцаў. Цяпер ІП гатовыя стварыць за 2010 год каля 65 тысяч працоўных месцаў у сферы гандлю і паслуг. Ламаць — не будаваць.

Зразумела і іншае: эканамічная палітыка і адпаведныя захады ў гэтай галіне ў Беларусі грунтуюцца найперш на палітычным складніку, і ўжо потым на законах рынку. Прывядзем яшчэ адзін прыклад, што ілюструе недастатковасць прымаемых мераў па спрашчэнні ўмоў вядзення бізнесу. 1 сакавіка 2010 года кіраўнік дзяржавы падпісаў указ № 127 «Аб унясенні дапаўненняў ва Указ прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 19 мая 1999 г. №285», паводле якога цяпер фармаваць нацэнкі і кошты ў рэстаранах, кафэ, барах, што адносяцца да нацэначных катэгорый люкс, вышэйшай і першай, можна будзе адвольна, то бок з улікам кан'юнктуры рынку.

Аднак гэта зноў толькі паўмера. Эксперты лічаць, што варта цалкам адпусціць сферу грамадскага харчавання ў вольнае плаванне, а таксама спрасціць умовы для адкрыцця рэстаранаў, кафэ. Гэта дазволіць сфарміраваць канкурэнты рынак, які і будзе рэгуляваць за кошт попыту спажыўца і бягучай прапановы. Аднак, і гэтага было б недастакова, каб наблізіць наша — нятаннае трэба сказаць — грамадскае харчаванне да даступных коштаў.

Напрыклад, высокія гандлёвыя надбаўкі на шэраг харчовых імпартных тавараў наўпрост уплываюць на канчатковы кошт стравы, якую вам падаюць у кафэ. І нават з умовай канкурэнцыі яго ўладальнік будзе вымушаны трымаць цэннік, каб не сысці ў «мінус». Вось яны — звёны ланцуга адной праблемы, якую немагчыма вырашыць кропкавымі метадамі.

# ФАКТЫ, ПАДЗЕІ, ЛЮДЗІ



## НАВІНЫ РЭГІЁНАЎ

### ГРОДНА. КАЗЮКАСЫ АБ'ЯДНАЛІ ЛІТВУ І БЕЛАРУСЬ

Традыцыйны кірмаш майстроў Казюкас у мінулы чацвер прайшоў у Гродна. Прыкладна ў тым жа фармаце, што ў Вільні, дзе свята доўжылася аж тры дні — з пятніцы да нядзелі. Многія з гродзенцаў, наведаўшы свае Казюкі, на выходныя з'ездзілі і на Казюкі віленскія. І там, і там можна было паспытаць традыцыйныя кулінарныя стравы, згатаваныя па старажытных рэцэптах розных рэгіёнаў Літвы, а таксама бліжняга замежжа. Майстры прадставілі на продаж свае вырабы. Была разнастайная культурная праграма. Шапікі майстроў у Гродна былі больш сціплымі, а ў Вільні сёлета яны расцягнуліся аж да будынку Сейма, занялі фактычна ўвесь праспект Гедыміна. Адбыліся імпрэзы і ў іншых частках старога горада, а на Лукішках прайшоў так званы «альтэрнатыўны Казюкас» з адмысловым моладзевым твістам. Пачынаючы з гэтага года кожны літоўскі Казюкас плануюць прысвячаць аднаму з этнарэгіёнаў Літвы. Сёлетні прысвечаны Дзукіі (рэгіён Літвы, які мяжуе з Беларуссю, а паводле літоўскіх этнографаў, распаўсюджваецца і на частку паўночна-заходняй Беларусі). На Ратушнай плошчы можна было пабачыць розныя інсталяцыі, прысвечаныя традыцыям дзукаў, выступілі народныя ансамблі, прадаваліся мастацкія выбары.

### МЁРЫ. «ВЯСЕЛЬНАЯ» ВЫСТАВА

У гісторыка-этнаграфічным музеі праходзіць «Вясельная» выстава. Выстава арганізавана Рэспубліканскай моладзевай грамадскай арганізацыяй «Студэнцкае этнаграфічнае таварыства» і праходзіць у рамках арт-праекта «Беларускі стыль», мэта якога — папулярызацыя народнай культуры, прымяненне яе каштоўнасцей у сучасным грамадстве. Сябры таварыства сабралі па Беларусі багата вясельнай атрыбутыкі, якую вырашылі паказаць жыхарам розных гарадоў нашай краіны.

### АШМЯНЫ. ШЧОДРЫ ПАДАРУНАК

Пяцьсот карцін падараваў масквіч Мікалай Карніл ашмянскаму краязнаўчаму музею падчас наведвання з жонкай горада. Гэты чалавек калекцыянуе мастацкія карціны ўжо 40 гадоў. У яго калекцыі — творы вядомых майстроў і маладых мастакоў Расіі, блізкага і далёкага замежжа.

### БРАСЛАЎ. РЭГІЯНАЛЬНЫ КОНКУРС

З мэтай папулярызацыі рэгіёна, яго прыродных, культурных і гістарычных асаблівасцей у гэтым годзе праводзіцца конкурс «Браслаўскі сувенір». На мэце стаіць распрацоўка брэнда Браслава і яго далейшае выкарыстанне ў рэкламных і прадстаўнічых мэтах. Арганізатары запрашаюць майстроў, мастакоў, дызайнераў узяць актыўны ўдзел. Прымаюцца вырабы, зробленыя ў розных тэхніках і накірунках (традыцыйныя і ўтылітарныя вырабы, дэкаратыўна-ўжытковыя, мастацкія, скульптура, мастацкая фатаграфія і г.д.). Галоўная ўмова — наяўнасць на сувеніры сімвалаў Браслава (назва, герб, памятныя даты). Свае працы ўдзельнікі конкурсу прадстаўляюць да 15 красавіка ў Музей традыцыйнай культуры. Журы ацэніць мастацкі ўзровень, суадносіны заяўленай тэматыкі, тэхналагічнае майстэрства. Пераможцы будуць названыя ў час правядзення «Браслаўскіх зарніц» 29–30 мая. Яны атрымаюць дыпломы і грашовыя прэміі: за 1-е месца — 5 базавых велічынь, за 2-е і 3-е месцы, адпаведна, — чатыры і тры базавыя велічыні.

### ВІЛЕЙКА. ПАМЯЦІ КРАЯЗНАЎЦЫ

Памёр краязнаўца Анатоль Рогач. Ён працаваў начальнікам раённых электрычных сетак. Неаднойчы выбіраўся ў раённы савет дэпутатаў. Але дзяржслужбу заўжды сумяшчаў са справай па аднаўленні беларушчыны. Ён быў лепшым знаўцам мінуўшчыны Вілейшчыны. Яго намаганнямі ў раёне паўсталі памятныя знакі вядомым землякам: Піліпу Орліку, Ігнацыю Ходзьку, Нікадзіму Сілівановічу, Адаму Гурыновічу. Пазалетась быў адкрыты помнік паўстанцам 1863 года каля вёскі Любкі. Планаваў краязнаўца паставіць яшчэ адзін, на месцы іншага бою каліноўцаў з царскімі войскамі. Ды не паспеў. Анатоль Рогач памёр на 63-м годзе жыцця.

З НАГОДЫ

## НЕЗАЛЕЖНАЙ ЛІТВЕ — 20 ГАДОЎ

**9 сакавіка амбасада Літоўскай Рэспублікі ў Беларусі ў гонар 20-годдзя незалежнасці краіны арганізавала святочны канцэрт у мінскай філармоніі.**



Беларускую грамадскасць віталі літоўскі амбасадар Эдмінас Багдонас, літоўскі і беларускі міністры культуры. Узгадваліся тыя падзеі ў даўняй і найноўшай гісторыі дзвюх краін, літоўскага і беларускага народаў, якія сведчылі пра трывалыя сувязі паміж нашымі дзяржавамі, традыцыі добрасуседства і супрацоўніцтва паміж народамі і асобамі. Цудоўны канцэрт, у цэнтры якога былі выступленні творчых груп і выканаўцаў Нацыянальнай школы мастацтваў Літвы, надалі асаблівы настрой і цеплыню гэтай сустрэчы.

ДЫЯЛОГ

## РЭЗАЛЮЦЫЯ ЕЎРАПАРЛАМЕНТА ПА БЕЛАРУСІ

**10 сакавіка Еўрапарламент большасцю галасоў ухваліў рэзалюцыю, якая асуджае стан грамадзянскай супольнасці і нацыянальных меншасцяў у Беларусі.**

У рэзалюцыі ўтрымліваецца патрабаванне вызваліць з турмаў палітычных актывістаў Андрэя Бандарэнку, Івана Міхайлава і Арцёма Дубскага, зарэгістраваць праваабарончы цэнтр «Вясна» і партыю БХД, якім шмат разоў было адмоўлена ў легалізацыі.

Еўрапарламентарыі патрабуюць зарэгістраваць Саюз палякаў Беларусі на чале з Анжалікай Борыс і перадаць арганізацыі яе ўласнасць. Рэзалюцыя заклікае беларускія ўлады гарантаваць свабоду слова ў Беларусі, забяспечыць магчымасці для работы СМІ, а таксама адмовіцца ад намераў кантраляваць інтэрнэт.

Разам з тым рэзалюцыя акцэнтуе ўвагу на падтрымцы палітыкі адкрытасці і дыялога Еўрасаюза з Беларуссю, але пад умовай, што такі дыялог будзе весці да паляпшэння сітуацыі ў галіне правоў чалавека ў краіне.

Рэзалюцыя таксама нагадвае афіцыйнаму Мінску, якія магчымасці мае Беларусь у выпадку выканання дэмакратычных нормаў: падпісанне пагаднення аб супрацоўніцтве і партнёрстве з Еўрасаюзам, фінансавая дапамога ЕБРР, Еўрапейскага інвестыцыйнага банку, атрыманне чарговых крэдытаў МВФ.

Аднак пры гэтым у дакуменце недвухсэнсоўна падкрэсліваецца, «што далейшае парушэнне правоў чалавека і асноў законнасці ў Беларусі можа прывесці да перагляду стаўлення Еўрасаюза да Беларусі, уключна з вяртаннем санкцый».

ПРАВЫ ЧАЛАВЕКА

## ПРАВААБАРОНЦЫ ПАДСУМАВАЛІ ВЫНІКІ

Генадзь КЕСНЕР

**Незарэгістраваны Праваабарончы цэнтр «Вясна» 9 сакавіка прэзентаваў агляд-хроніку парушэнняў правоў чалавека ў Беларусі ў 2009 годзе. Агляд ужо выдадзены асобнай кніжкай.**

Агляд-хроніка падрыхтаваны на падставе кароткіх паведамленняў у галіне правоў чалавека ў Беларусі за кожны месяц 2009 года. На пачатку агляду даецца агульны аналіз грамадска-палітычнай сітуацыі ў краіне за азначаны перыяд, асвятляюцца найважнейшыя падзеі і рэакцыя на іх з боку міжнароднай супольнасці. Прыводзяцца канкрэтныя факты парушэнняў правоў чалавека, на прыкладзе якіх можна прасачыць пэўную гісторыю барацьбы прадстаўнікоў беларускай дэмакратычнай супольнасці за асноўныя правы і свабоды.

Як адзначаюць аўтары агляду, асноўнымі парушэннямі летась былі палітычна матываваныя крымінальныя і адміністрацыйныя пераследы, знішчэнне свабоды слова, забарона мірных сходаў, адмова ў праве на асацыяцыю.

Па словах кіраўніка «Вясны» Алеся Бяляцкага, беларускія праваабаронцы канстатуюць пэўную змену рэпрэсіўных інструментаў.

«У нас сапраўды стала менш людзей, якія пераследаваліся ў крымінальным парадку або якія «сядзелі на сутках». У той жа час у нас павялічылася колькасць людзей, якіх збівалі, у нас аднавілася практыка прызыву ў войска палітычна актыўных маладых людзей, у нас з'явіліся такія рэчы, як прэвентыўнае затрыманне і вываз людзей за межы горада перад нейкімі акцыямі, чаго раней не было. Ужо пры канцы 2009 года было відавочна, што пачынаецца прэзідэнцкая кампанія, і ўзровень рэпрэсій пры канцы года, у снежні, пачаў расці.

Пачатак 2010 года вызначыўся рэзкай канфрантацыяй і накручваннем сітуацыі з няўрадавымі арганізацыямі, у прыватнасці, з Саюзам палякаў на Беларусі, а таксама з правядзеннем акцый, калі яны жорстка разганяліся, напрыклад, у лютым. Таксама застаецца праблема нерэгістрацыі грамадскіх аб'яднанняў — літаральна днямі чарговую адмову ў рэгістрацыі атрымала Асамблея няўрадавых арганізацый», — адзначыў Алесь Бяляцкі.

Юрыст Валянцін Стэфановіч звярнуў увагу на тое, што дагэтуль у Беларусі не вырашана пытанне адмены ганебнага артыкула 193-1 Крымінальнага кодэксу, які прадугледжвае крымінальную адказнасць за дзейнасць ад імя незарэгістраванай арганізацыі.

Паводле Алеся Бяляцкага, беларускія ўлады працягваюць парушаць Канстытуцыю краіны, не выконваюць свае міжнародныя абавязацельствы.

КАНФЕРЭНЦЫЯ

## АХОЎВАЦЬ ПОМНІКІ РАЗАМ

Аляксей ХАДЫКА

**6 сакавіка ў Музеі беларускага народнага мастацтва (філіі Нацыянальнага мастацкага музея Беларусі), у будынку былога касцёла святога Мацвея ў Раўбічах, прайшла навукова-практычная канферэнцыя «Праблемы аховы і інтэрпрэтацыі помнікаў гісторыі і культуры. Узаемадзеянне грамадскасці і дзяржавы».**

Тэма засведчыла неардынарнасць падзеі: дзяржаўныя і грамадскія структуры ўпершыню за доўгі час працягнулі адно аднаму рукі.

Зацікаўленасць у практычным дыялогу была падкрэслена ў і вітанні яе ўдзельнікаў міністра культуры Паўла Латушкі, агучаным загадчыцай сектара аховы помнікаў Упраўлення па ахове гісторыка-культурнай спадчыны і рэстаўрацыі МК Наталляй Хвір: «З невядомых прычынаў была парушана сувязь паміж грамадствам і людзьмі, якія прымаюць рашэнні, але на сённяшні дзень Міністэрства культуры вельмі зацікаўлена ў наладжванні дыялога паміж Міністэрствам культуры і грамадствам».

Пажаданне аднаўляць сувязі адрасавалася як шырокай грамадскасці, так і канкрэтнай арганізацыі, актыўнасць якой апошнім часам навідавоку — Беларускаму добраахвотнаму таварыству аховы помнікаў гісторыі і культуры (БДТАПГК). Менавіта яно і выступіла арганізатарам канферэнцыі ў межах культурніцкай кампаніі «Будзьма беларусамі».

Кіраўнік БДТАПГК Антон Астаповіч, гаворачы пра тэорыю і практыку дзяржаўнай палітыкі па ахове спадчыны, звярнуў увагу на драматычнае сутыкненне двух працэсаў. Практычнай рэгенерацыі гістарычнай культурнай прасторы супярэчаць камерцыйнае выкарыстанне і хаатычнае будаўнічае засваенне ахоўных аб'ектаў і тэрыторый. У сітуацыі, калі адсутнічае дзейсная інспекцыя па ахове помнікаў, закон не спрацоўвае. Прыкладам, уключэнне летам мінулага года каля 270 аб'ектаў у ахоўны спіс у Брэсце не выратавала некалькі з іх ад выстаўлення на аўкцыён. Спробы БДТАПГК ратаваць ад варварскай перабудовы гістарычны цэнтр Мінска зваротамі ў пракуратуру пра парушэнне закона пакуль ні разу не прывялі да рэальнага пакарання парушальнікаў.

Аляксандр Ярашэвіч, вядомы спецыяліст у гісторыі старажытнабеларускага мастацтва, прывёў цэлы мартыралог твораў скульптуры і іканапісу, якія загінулі ў апошнія дзесяцігоддзі ў полымі пажараў, у асноўным у драўляных храмах.

Археолаг і гісторык Міхась Чарняўскі закрануў тэму разбурэння археалагічных помнікаў «чорнымі капальнікамі». Колішні настаяцель раўбіцкай каталіцкай парафіі Ігар Лашук узняў праблему вяртання былых храмаў, у якіх размясціліся свецкія ўстановы, царкве. У прыватнасці, гутарка ішла пра касцёл у Раўбічах, зачынены яшчэ расійскімі ўладамі ў 1866 годзе за спяванне прыхаджанамі патрыятычных гімнаў падчас паўстання Каліноўскага.

Адказ на сфармуляванае Антонам Астаповічам пытанне, што чакае Беларусь у будучыні — «ці небыццё нашай спадчыны, ці яе захаванне і паступовае адраджэнне» — залежыць ад уліку інтарэсаў усіх яго ўдзельнікаў.

## ТЫДНЁВЫ АГЛЯД

# НЕ СЛУХАЙ БАЦЬКУ!

Сяргей САЛАЎЁЎ

**Наш народ любіць святкаваць і ўмее гэта рабіць. Але, як не дзіўна, тры дні «свята жанчын» ніяк не паўплывалі на больш працоўны настрой нашага грамадства. Няўжо мы і працаваць любім і ўмеем больш, чым святкаваць?**



Напачатку дзіўнае дзіва. Сябры нацыянал-бальшавіцкага руху Беларусі не знайшлі іншага часу, апроч 7 сакавіка, каб паведаміць грамадству пра свой сыход у апазіцыю да Аляксандра Лукашэнкі. Яны падтрымлівалі яго ад 1994 года — з тых часоў, калі Аляксандр Рыгоравіч стаў прэзідэнтам. 16 гадоў ім спатрэбілася для таго, каб расчаравацца ў палітыцы беларускага правадыра.

У прыватнасці, як адзначыў адзін з лідэраў нацболаў Яўген Контыш, раней актывісты руху глядзелі на сітуацыю ў Беларусі «з сумненнем, але з надзеяй на паляпшэнне». І патлумачыў: «Мы думалі, што крытыка злева будзе ўлічана дзейнай уладай. Аднак нам чатыры разы адмаўлялі ў рэгістрацыі, нам не давалі праводзіць акцыі. Зараз улада Беларусі выказвае нерашучасць у пытаннях прызнання незалежнасці Абхазіі, Паўднёвай Асеціі і Прыднястроўя. І саюз Беларусі і Расіі пераўтвbooрыўся ў папулізм».

Дый самі нацболы, паводле лідэраў, доўга трывалі. Практычна кожны другі актывіст зведаў вобшук ці асабісты дагляд. Нацболы пазнаёміліся з цэнтрам ізаляцыі правапарушальнікаў на вуліцы Акрэсціна ў Мінску. Некаторыя былі прыгавораныя да штрафаў за дзейнасць ад імя незарэгістраванай арганізацыі. Улічваючы ўсе гэтыя факты, беларускія нацыянал-бальшавікі прынялі рашэнне пайсці ў апазіцыю. «Нас не задавальняе міліцэйскае бязладдзе, нас не задавальняе тое, што адбываецца ў краіне, нас не задавальняе, што будуецца не «дзяржава для народа», а дзяржава для чыноўнікаў. І мы будзем дзейнічаць ад імя грамадзян Беларусі», — заявіў Контыш.

Прычым гэта — не вельмі прыемная навіна і для ўлады. Як было паведамлена, прыярытэтам для актывістаў НБП застануцца вулічныя акцыі і радыкальныя акцыі «прамога дзеяння». «У апазіцыі няма будучыні, калі яна не будзе радыкальнай. Улады ж дзейнічаюць радыкальна, і ім можна супрацьпаставіць толькі радыкалізм», — падкрэсліў Контыш.

Наколькі сур'ёзны гэты радыкалізм, мы паглядзім. Але ж сам факт сыходу ў апазіцыю тых, каго шмат гадоў лічылі «ценявой баявой структурай» беларускай улады, кажа шмат пра што. Нават ім надакучыла співаць «Слухай бацьку!», калі, па іх меркаванні, сам бацька іх не слухае. Дарэчы, заява пра сыход у апазіцыю так і называецца: «Да пабачэння, бацька!».

Самога Аляксандра Рыгоравіча гэты пасаж, я думаю, не вельмі закране. Хутчэй, больш яго засмучаюць паразы на дыпламатычным фронце.

Яшчэ не сцерлася з памяці, як Лукашэнка «спазніўся» на інаўгурацыю новага прэзідэнта Украіны Віктара Януковіча. Калі спікер Вярхоўнай рады Уладзімер Літвін абвясціў, што сярод прысутных прэзідэнтаў ёсць Лукашэнка, таго ў зале не было, — камеры паказалі пустое месца. Лукашэнка прыехаў крыху пазней, і ціха сеў у куточку. Злыя языкі кажуць, што гэтае «спазненне» было запланавана, каб пазбегнуць скандалу паміж беларускім правадыром і іншымі ўдзельнікамі інаўгурацыі. Сярод якіх былі прадстаўнікі Еўрасаюза і Польшчы. Якраз тады ў Беларусі ўзмацніўся скандал наконт Саюза палякаў на Беларусі.

Зараз амаль такім жа чынам дзейнічала Літва. Запрашэнне А. Лукашэнку ўзяць удзел ва ўрачыстасцях з нагоды 20-й гадавіны аднаўлення незалежнасці Літвы, што адбылася 11 сакавіка ў Вільні, было накіравана ад імя канцылярыі прэзідэнта Літвы. Але яшчэ раней за навіну пра гэта запрашэнне была распаўсюджаная іншая інфармацыя. Пра тое, што Сейм Літвы запрасіў на святкаванне першага кіраўніка незалежнай Беларусі, былога старшыню Вярхоўнага Савета Беларусі Станіслава Шушкевіча.

Зразумела, што ў такім выпадку ў святочных мерапрыемствах павінен удзельнічаць толькі адзін: або Шушкевіч, або Лукашэнка, бо ў іх, мякка кажучы, узаемная алергія. А паколькі запрашэнне Шушкевічу прыйшло раней, і ён пагадзіўся яго прыняць, то Аляксандру Лукашэнку ніякіх шанцаў не заставалася. Афіцыйную беларускую дэлегацыю ўзначаліць намеснік прэм'ер-міністра Віктар Бура.

У пасланні ў адказ Лукашэнка «выказаў шчырую падзяку» літоўскаму калегу за запрашэнне і адзначыў высокі патэнцыял далейшага развіцця палітычных, эканамічных і культурных сувязей у інтарэсах беларускага і літоўскага народаў, паведамляе прэс-служба прэзідэнта. «Падкрэсліўшы важнасць умацавання дыялогу на вышэйшым дзяржаўным узроўні, прэзідэнт Беларусі пацвердзіў запрашэнне кіраўніку літоўскай дзяржавы наведаць Рэспубліку Беларусь з візітам», — гаворыцца ў паведамленні.

Заўважым, што, паводле паведамлення прэс-службы прэзідэнта, у падзяках Лукашэнкі на запрашэнне няма віншавальных слоў з нагоды юбілею аднаўлення Літвой незалежнасці. І гэта таксама сімптаматычна.

Але навошта беларускаму правадыру ехаць на нейкія святкаванні і саміты, калі і тут можна павесяліцца? Апроч таго, што Аляксандр Лукашэнка на нарадзе 9 сакавіка ў цэлым ухваліў прапанаваную ўрадам канцэпцыю развіцця ігральнага бізнесу ў Беларусі, ёсць і іншыя людзі, якія здольныя яго рассмяшыць.

Экстрэмальны турыст Пал Палыч Барадзін доўга насіўся з ідэяй адзінай валюты Саюзнай дзяржавы. Не атрымалася. Зараз ён увогуле заявіў, што «мы абавязкова ўвядзем адзіную валюту ў межах Мытнага саюза». Але ён не паведаміў, у які стагоддзі гэта будзе, бо зараз само існаванне Мытнага саюза знаходзіцца пад пагрозай. Нават існуе думка, што калі Расія не будзе прадаваць Беларусі нафту без пошлінаў, то і Беларусь адмовіцца ад увядзення адзіных пошлінаў з Расіяй — напрыклад, на аўтамабілі. І тады Мытны саюз спасцігне той жа лёс, што і Саюзную дзяржаву.

Дый беларускіх жартаўнікоў хапае. Беларусь уступіла «ў практычную фазу рэалізацыі праекта па будаўніцтве атамнай станцыі», заявіў намеснік міністра энергетыкі Юрый Рымашэўскі 10 сакавіка ў Мінску на адкрыцці другой Міжнароднай спецыялізаванай выставы «Атамэкспа-Беларусь». Паводле слоў намесніка міністра, зараз праводзяцца грамадскія слуханні па справаздачы аб ацэнцы ўздзеяння на навакольнае асяроддзе (АУНА) у сумежных краінах. Ён паведаміў, што «актыўна распрацоўваецца нарматыўна-прававая база», пачата падрыхтоўка спецыялістаў для будучай АЭС.

Калі слуханні і «бла-бла-бла» — гэта практычная фаза, то я — кітайскі лётчык. Тым больш, што Літва ўжо дала адлуп Беларусі на аналагічных слуханнях, і не факт, што таго ж не здарыцца ў Эстоніі, Польшчы і Украіне. Так што пра «практычную фазу» казаць як мінімум зарана.

## ФІГУРЫ ТЫДНЯ

### АНДРЭЙ САННІКАЎ



Каардынатар «Хартыі–97» Андрэй Саннікаў агучыў 6 сакавіка ў Вільні падчас запісу перадачы «Форум» на тэлеканале «Белсат» свой намер балатавацца на наступных прэзідэнцкіх выбарах, якія адбудуцца на пачатку 2011 года. Андрэй Саннікаў у свой час зрабіў добрую дыпламатычную кар'еру.

Будучы кандыдат у прэзідэнты нарадзіўся ў Мінску ў 1954 годзе (аднагодак дзеючага кіраўніка Беларусі), скончыў Мінскі дзяржаўны лінгвістычны універсітэт. Напрыканцы 1980-х працаваў у Сакратарыяце ААН у Нью-Йорку, затым у Міністэрстве замежных спраў Беларусі, быў дарадцам Місіі Беларусі ў Жэневе. У 1995 годзе Аляксандр Лукашэнка прызначыў Саннікава намеснікам міністра замежных спраў Рэспублікі Беларусь. Аднак праз год, перад самым рэферэндумам, дыпламат і наменклатурны чыноўнік сышоў у адстаўку. З таго часу Андрэй Саннікаў папоўніў апазіцыйныя шэрагі. З лістапада 1996 года з'яўляецца каардынатарам нефармальнай грамадскай ініцыятывы «Хартыя–97», таксама цяпер займаецца арганізацыяй дзейнасці грамадскай кампаніі «Еўрапейская Беларусь».

Раней пра намер удзельнічаць у прэзідэнцкай кампаніі заявіў экс-намеснік старшыні партыі БНФ Алесь Міхалевіч.

### ВІКТАР ГАНЧАРЭНКА



Барысаўская футбольная каманда БАТЭ пад кіраўніцтвам Віктара Ганчарэнкі стала ўладальніцай Суперкубка Беларусі. Гэты тытул разыгрываўся толькі аднойчы, 1994 годзе, — тады мінскае «Дынама» перамагло бабруйскі «Фандок». Сёлета ў барацьбе за кубак БАТЭ адолела наваполацкі «Нафтан». Лепшым гульцом паядынку быў названы брамнік БАТЭ Сяргей Верамко. Барысаўскі клуб атрымаў за перамогу ў Суперкубку Беларусі 15 тысяч долараў. Каментуючы сустрэчу, галоўны трэнер БАТЭ Віктар Ганчарэнка зазначыў, што «тытулаў зашмат быць не можа».

Цікава, што ў перапынку паміж матчамі кіраўніцтва клубу фактычна перадало атрыманыя за перамогу грошы алімпійскаму чэмпіёну Ванкувера. Фрыстайліста Аляксея Грышына і яго трэнера Мікалая Казеку БАТЭ ўзнагародзіў за алімпійскае золата, у тым ліку і матэрыяльна. Аляксею ўручылі грашовы сертыфікат на 30 мільёнаў рублёў, яго настаўніку — на 15 мільёнаў рублёў.

Нагадаем, што ў 2008 годзе барысаўская каманда пад кіраўніцтвам Віктара Ганчарэнкі ўпершыню ў гісторыі беларускага футбола патрапіла ў групавы этап Лігі чэмпіёнаў.

### ВІТАЛЬ АРТЫСТ



Галоўную рок-карону 2009 года — прэмію ў сферы альтэрнатыўнай музыкі — атрымаў гурт «BeZ bileta», лідэрам якога з'яўляецца музыкант Віталь Артыст. Таксама калектыў перамог у намінацыях «Альбом года» (альбом «Афрыка») і «Кліп года» (на песню «Афрыка»). «Я пакуль яшчэ не асэнсаваў, што азначае для нас гэтая перамога. Паколькі для нас свята — гэта любы канцэрт, кантакты з публікай. Лепшая ўзнагарода для нас — гэта запрашэнне зайграць на канцэрце», — перадае словы лідэра калектыву Віталя Артыста БелаПАН пасля абвяшчэння вынікаў конкурсу.

Калектыў працуе на беларускай сцэне ад 1998 года. За гэты час слухачам было прадстаўлена сем альбомаў, а творчасць «BeZ bileta» некалькі разоў адзначалася на «Рок-каранацыі». Так, калектыў быў прызнаны «Адкрыццём года» па выніках 2000-га. Тады падчас свайго выступу на «Рок-каранаванні» гурт зладзіў «урачыстае адкрыццё» слоіка салёных агуркоў. Уражаны лідэр групы «Ляпіс Трубяцкой» і вядомы рок-музыка Сяргей Міхалок падараваў калектыву ўласную гітару.

Апроч «BeZ bileta», сёлета на цырымоніі «Рок-каранацыі» была адзначаная творчасць Зміцера Вайцюшкевіча («Выканаўца года»), гурта «Ляпіс Трубяцкой» («Песня года» — кампазіцыя «Ружовыя акуляры»), гурта «The Toobes» («Дэбют года»). Гурт «Крама» перамог у намінацыі «Традыцыі і сучаснасць», «Нейра Дзюбель» — у намінацыі «За вялікі ўнёсак у развіццё беларускага рока», «Князь Мышкін» — у намінацыі «За адданасць жанру». Рок-князёўнай была названая салістка калектыву «Naka» Анастасія Шпакоўская.

Лепшым «Поп-рок-праектам» стаў гурт «Open Space». У намінацыі «Праект года» адзначаны альбом «Тузін Гітоў. Перазагрузка», у намінацыі «Падзея года» — канцэрт «N.R.M». Гурт «Нестандартны варыянт» атрымаў крыштальную карону ў намінацыі «Рэп-праект года», а «Жнюв» — у намінацыі «Вяртанне года».

ТРЭЦІ СЕКТАР

# АЛЯКСАНДР КАМАРОЎСКІ

Аляксандр ТАМКОВІЧ

**10 сакавіка распачаўся суд над Мікалаем Аўтуховічам. Герой нашага нарыса Аляксандр Камароўскі лічыць гэты судовы працэс палітычна матываваным. Сапраўдная прычына, на яго погляд, у тым, што менавіта Мікалай Аўтуховіч быў адным з трох падпісантаў вядомага ліста прэзідэнту і ініцыятарам публічнай адмовы ад юбілейных медалёў, якія наша дзяржава прысвяціла 20-годдзю вываду савецкіх войскаў з Афганістана. Ад дзяржаўных узнагарод тады адмовіліся каля 10 працэнтаў «афганцаў», якіх чамусьці было прынята лічыць найбольш моцным электаральным апірышчам існуючай улады.**



## Пераезд пад прымусам

Аляксандр Камароўскі нарадзіўся 29 мая 1942 года на спецпасяленні Чуртан Гаінскага раёна Пермскай вобласці, у вярхоўі ракі Камы. У гэтыя мясціны падчас рэпрэсій пачатку 30-х гадоў мінулага стагоддзя вывезлі сем'і будучых бацькоў Камароўскага. Сям'ю маці, Марыі Аляксандраўны, — з вёскі Забродзенне, што за дзевяць кіламетраў ад Жодзіна. Сям'ю бацькі, Аляксандра Адамавіча, — з хутара Ліпавы Капец Мінскага раёна.

Хаця род Камароўскіх з карэнных беларускіх, але ў яго жылах цячэ і значная частка замежнай крыві. Па лініі маці, у прыватнасці, — французскай. У даўнім 1812 годзе, падчас трагічнай пераправы войскаў Напалеона праз Беразіну, адзін з жаўнераў, без вінтоўкі, стомлены і галодны, забрыў у вёску, дзе жылі продкі Камароўскага, і нейкая з яго прапрабабак вынесла бедалазе вады і ежы. І ўзнікла каханне…

А па лініі бацькі ёсць і польскія гены. За ўдзел у паўстанні Кастуся Каліноўскага продкаў Аляксандра, звычайных сялян, з заходніх раёнаў перасялілі бліжэй да Мінска. У 1930 годзе іх нашчадкаў «раскулачылі» і дэпартавалі значна далей на поўнач.

Камендатура НКУС у пасёлку Чуртан праіснавала да 1956 года і запомнілася Камароўскаму вельмі добра. З дачкой яе начальніка ён нават вучыўся ў адным класе. Акрамя беларускай «дыяспары» там жылі яшчэ паволжскія немцы, палякі і ўкраінцы з. А ў 1944 годзе да сасланых дадалі яшчэ і крымскіх татар.

Адносіны паміж усімі былі надзвычай сяброўскімі. Мабыць, менавіта таму, калі Аляксандру прапанавалі выканаць «інтэрнацыянальны абавязак» у Афганістане, ён успрыняў гэта за вялікі гонар.

## Абавязак без прымусу

Сярэднюю школу Аляксандр Камароўскі скончыў у 1959 годзе і паступіў у Томскае вышэйшае вайсковае артылерыйскае вучылішча. Але гарматы не спадабаліся, вучобу кінуў і вярнуўся ў родную хату. Два гады працаваў памочнікам машыніста паравозу на вузкакалейнай чыгунцы.

У 1961 годзе падышлі тэрміны вайсковай службы, і Камароўскі зноў абраў вайсковае вучылішча. Але на гэты раз — Іркуцкае авіяцыйна-тэхнічнае. Чаму ж падаўся не ў лётчыкі, а ў «тэхнары» — выбар амаль бесперспектыўны з пункту погляду кар'еры? Бо Аляксандр ніколі не збіраўся стаць генералам і добра ўсведамляў, што для сына ссыльных у Савецкім Саюзе любая кар'ера была немагчымай.

Праз тры гады Камароўскі скончыў вучобу і на дзесяць гадоў трапіў на Далёкі Усход. Служыў бартавым тэхнікам на ваенна-транспартных самалётах. Атрымаць вышэйшую адукацыю жадання ніколі не ўзнікала. З той жа прычыны: хутка ўздымацца па службовай лесвіцы яму не дасць КДБ. Нават ад палётаў яго экіпажа ў савецкія гарнізоны, размешчаныя за межамі СССР, Камароўскага нязменна адхілялі, бо ён не меў допуску «формы 2», які давала толькі галоўная спецслужба СССР. На яго месца садзілі каго-небудзь з «правільнай» біяграфіяй.

Адзіная краіна ў замежжы, дзе яму дазволілі служыць, быў Афганістан.

Сёння погляд на тую вайну пераважна негатыўны. І гэта цалкам абгрунтавана. Аднак у савецкія часы да «інтэрнацыянальнага абавязку» ставіліся інакш. Не аднойчы Аляксандр быў сведкам, калі «за рэчку» ехалі па шчыраму ўласнаму жаданню. І толькі там пачыналі разумець, што рэчаіснасць цалкам не адпавядае клішэ савецкай прапаганды.

Пасля службы на Далёкім Усходзе Камароўскага накіравалі на Украіну. Спачатку ў Крывы Рог (1974) , а ў 1978 годзе — у пасёлак Арцыз, што ў 140 кіламетрах ад Адэсы. Былая Бесарабія. У снежні 1979 года савецкія войскі ўвайшлі ў Афганістан.

Полк, у якім служыў Камароўскі, на той час начальнікам групы авіяцыйнага абсталявання, у афганскай аперацыі прымаў самы непасрэдны ўдзел. Першы час з ташкенцкага (40 кіламетраў) вайсковага аэрадрому Чынчык.

2 чэрвеня 1981 года Аляксандр Камароўскі трапіў непасрэдна ў Кабул. І праваяваў цэлых паўтара гады. Нагрузка нечалавечая. Пад'ём а 4–5 раніцы, адбой — а 12 ночы. І так кожны дзень. Да 25 кастрычніка 1982 года.

## Пад прымусам сумлення

За Афганістан Аляксандр Камароўскі атрымаў афіцэрскі ордэн *«За службу Родине в Вооруженных Силах СССР»* трэцяй ступені і шматлікія граматы, у тым ліку і ад старшыні Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР. У запас ён зволіўся ў званні маёра. Падпалкоўніка яму далі ўжо тут. Бо тады яшчэ ніхто не ведаў, што Камароўскі лічыць тую вайну несправядлівай і перакананы ў тым, што менавіта яна «разваліла» Савецкі Саюз.

Па-першае, СССР не вытрымаў эканамічнай напругі. Па-другое, яго доўгі час ігнараваў амаль цэлы свет. Па-трэцяе, за 10 гадоў праз «афган» прайшлі 620 тысяч вайскоўцаў і больш за 300 тысяч «цывільных» спецыялістаў. У суме атрымліваецца каля мільёна чалавек. Многа гэта ці мала? Мабыць, многа, бо, калі яны ўсе вярнуліся назад, гэта значна пахіснула ўстоі савецкай улады. Перш за ўсё таму што гэта былі людзі, якія ўсумніліся ў існуючай уладзе і да таго ж перасталі баяцца.

Дарэчы, усе бунты, якія потым скончыліся «парадам суверэнітэтаў», па вялікаму рахунку, пачыналіся з «афганцаў». Так мяркуе Камароўскі, які вывучаў гэта пытанне спецыяльна.

Як вобразна кажа сам Аляксандр, ён не з тых, хто будзе «хадзіць у зялёных армейскіх штанах і здаваць пустыя бутэлькі». Таму ў сярэдзіне 80-х гадоў мінулага стагоддзя актыўна пачаў займацца «афганскім рухам», які ў розныя часы называўся па-рознаму. Сёння — грамадскае аб'яднанне «Грамадскі рух інвалідаў вайны ў Афганістане». Адзін з сегментаў таго, што называецца «трэцім сектарам».

«Наезды» на Камароўскага пачаліся адразу ж, як толькі сталі вядомымі яго погляды. І гэта абсалютна зразумела, бо заўсёды лічылася, што «афганцы» ледзь не фанатычна падтрымліваць сучасную ўладу, якая быццам бы ў іх успрыманні асацыюецца з той дзяржавай, за якую яны ваявалі. А тут такое разбурэнне міфа!

Пералічваць усе прыклады ціску сэнсу няма, бо іх (у тым ліку і фальшывыя долары на беларуска-польскай мяжы ў верасні 2006 года, аб чым Камароўскі ведаў за два тыдні да самога здарэння) было вельмі шмат. Акцэнтую вашу ўвагу толькі на «справе Аўтуховіча».

У мінулым годзе споўнілася 20 гадоў з моманту вываду савецкіх войскаў з Афганістана, і беларуская ўлада вырашыла ўзнагародзіць усіх удзельнікаў той вайны юбілейнымі медалямі. І для яе было цалкам нечаканым, што ў такім «лаяльным» асяроддзі можа ўзнікнуць нейкі пратэст.

Напрыканцы студзеня 2009 года ў СМІ з'явіўся адкрыты зварот Аляксандра Камароўскага, Мікалая Аўтуховіча і Алега Волчака да прэзідэнта краіны, кіраўніка ўрада і «афганцаў», дзе выказвалася прапанова замацаваць статус удзельнікаў, выдаць усім адпаведныя пасведчанні і ўстанавіць пэўныя льготы, бо ў любой нармальнай краіне свету тых, хто ваяваў, лічаць элітай грамадства. І прагучаў заклік у адваротным выпадку адмовіцца ад узнагарод.

Можна толькі ўявіць, які пачаўся «шорах». Адпаведная «работа» была праведзена амаль з кожным «афганцам», імгненна вырашаліся пытанні, якія да гэтага часу «буксавалі» гадамі. На многіх прадпрыемствах краіны дадаткам да кожнага медаля быў «бонус» памерам 130–150 тысяч беларускіх рублёў.

Так што, з аднаго боку, мэта была дасягнутай. «Наверсе» пачалі варушыцца і зрабілі спробы звесці ўсе пратэсты да «кавалка каўбасы». Не атрымалася.

Пад зваротам Камароўскага, Волчака і Аўтуховіча па ўсёй Беларусі падпісалася каля чатырохсот чалавек, а медалі адмовіліся атрымаць больш як дзве тысячы. Калі ўлічыць, што ў Беларусі «афганцаў» толькі 21 тысяча, атрымліваецца даволі значная лічба. Зразумела, падобнае «свята непаслухмянасці» ўлада дараваць не магла. Але Аляксандр Камароўскі з паплечнікамі не здаюцца.

СУД

# ПАЧАЎСЯ ГУЧНЫ ПРАЦЭС

Генадзь КЕСНЕР

**У Вярхоўным судзе Беларусі пачаўся разгляд крымінальнай справы былых ваўкавыскіх прадпрымальнікаў Мікалая Аўтуховіча і Уладзіміра Асіпенкі, якіх, апроч іншага, абвінавачваюць у падрыхтоўцы тэрарыстычнага акту.**

Жадаючыя патрапіць на судовае пасяджэнне пачалі прыбываць да будынка Вярхоўнага суда яшчэ за некалькі гадзін да пачатку слуханняў. Людзей было даволі шмат, таму трапіць у залу атрымалася далёка не ва ўсіх, з-за абмежаванасці колькасці месцаў. Варта адзначыць, што «па-за працэсам» апынуліся і многія журналісты, якія не дадумаліся загадзя акрэдытавацца на пасяджэнне суда.

На маёй памяці не было такога, калі б патрабавалася загадзя запісвацца, пільнаваць чаргу, каб займацца сваімі прафесійнымі абавязкамі. Яшчэ добра, што на першым пасяджэнні ўдалося папрысутнічаць прадстаўнікам амбасад некаторых краін Еўрасаюза, а таксама Офіса АБСЕ ў Мінску.

На пачатку пасяджэння суд не задаволіў хадайніцтва аб дазволе фота- і відэаздымак падчас працэсу, бо адзін з фігурантаў справы Аляксандр Ларын выказаўся супраць.

Як распавёў прадстаўнік Беларускага Хельсінскага камітэта Зміцер Чарных, Мікалай Аўтуховіч адразу заявіў хадайніцтва дапусціць да працэсу ў якасці абаронцаў юрыста Алега Волчака і старшыню аргкамітэта па стварэнню аб'яднання ветэранаў баявых дзеянняў у Афганістане Аляксандра Камароўскага, але высокі суд палічыў, што вязням будзе дастаткова паслуг прафесійнага адваката Паўла Сапелкі. Хаця па словах Алега Волчака, Крымінальна-працэсуальны кодэкс не абмяжоўвае колькасць абаронцаў на падобных працэсах.

У сваю чаргу, адвакат Павел Сапелка заявіў два хадайніцтвы: перадаць справу ў суд ніжэйшай інстанцыі — Мінскі гарадскі або Гродзенскі абласны, каб падсудны меў магчымасць абскардзіць прысуд, калі ён будзе абвінаваўчым. Справа ў тым, што разгляд справы ў Вярхоўным судзе пазбаўляе абвінавачанага магчымасці падаваць касацыйную скаргу. Павел Сапелка таксама папрасіў запатрабаваць з суда Ваўкавыскага раёна так званую «справу Козела», якая, на думку абаронцы, даказвае невінаватасць Уладзіміра Асіпенкі.

Пракурор выказаў пярэчанне гэтым хадайніцтвам, падтрымаўшы толькі хадайніцтва аб дадатковым вывучэнні абаронай матэрыялаў крымінальнай справы і адвёў на гэта амаль тыдзень. Хаця, на думку Алега Волчака, гэтага часу вельмі мала для таго, каб вывучыць тысячу аркушаў матэрыялаў крымінальнай справы.

Наступнае пасяджэнне Вярхоўнага суда па справе Аўтуховіча — Асіпенкі адбудзецца 16 сакавіка.

КАМІСІІ

# АПАЛІТЫЧНЫ СІНДРОМ

Марыя КРУК

**На мінулым тыдні скончыўся тэрмін вылучэння прэтэндэнтаў ва ўчастковыя выбарчыя камісіі па выбарах у мясцовыя саветы дэпутатаў — у структуры, дзе ўласна адбываецца падлік галасоў. Паводле інфармацыі Цэнтрвыбаркама, працаваць у іх складзе выказалі жаданне больш за 77 тысяч чалавек. Прадстаўнікі партый ад колькасці заяўнікаў складаюць менш за тры працэнты.**



Найбольш сярод іх тых грамадзян, якія вылучаліся шляхам падачы заяў — больш за 40 працэнтаў, ад працоўных калектываў — 22,5 працэнта, палітычных партый і грамадскіх аб'яднанняў — 37,3 працэнта. Аднак непасрэдна на палітычныя партыі прыпадае толькі 2,9 працэнта ад агульнай колькасці прэтэндэнтаў на ўключэнне ў склад участковых выбаркамаў, што, уласна, і з'яўляецца яскравым сведчаннем ступені развіцця і плюралізму палітычнай сістэмы дзяржавы.

Па звестках ЦВК, найбольшая колькасць вылучэнцаў ад Камуністычнай партыі Беларусі (516 прадстаўнікоў), Беларускай сацыяльна-спартыўнай партыі (434 прадстаўнікі), Рэспубліканскай партыі працы і справядлівасці (358 прадстаўнікоў), таксама сваіх сябраў вылучылі Беларуская аграрная партыя, Ліберальна-дэмакратычная і Рэспубліканская партыі. Расклад па апазіцыйных партструктурах наступны: Аб'яднаная грамадзянская партыя — 281 прадстаўнік, Беларуская партыя левых «Справядлівы свет» — 160, партыя БНФ — 122, Беларуская сацыял-дэмакратычная партыя (Грамада) — 24, «Беларуская сацыял-дэмакратычная Грамада» — 9, КХП БНФ — 8 чалавек. Што тычыцца вылучэнцаў ад грамадскіх аб'яднанняў, то традыцыйна найбольш кандыдатаў у выбаркамы выставілі «Белая Русь», БРСМ, Федэрацыя прафсаюзаў Беларусі ды Беларускае грамадскае аб'яднанне ветэранаў.

Паралельна ўвесь гэты час (да 15 сакавіка) працягваецца прыём дакументаў па вылучэнню кандыдатаў у дэпутаты мясцовых саветаў. І, як адзначаюць прадстаўнікі праваабарончых арганізацый, якія адсочваюць ход выбарчага працэсу, не ўсё так гладка. Напрыклад, у некаторых рэгіёнах увогуле не вылучаюцца апазіцыйныя кандыдаты. Адна з прычынаў гэтага — ціск з боку мясцовых уладаў. «У Рагачове работнік мясцовай школы мастацтваў Мікалай Мельнікаў, сябра партыі «Справядлівы свет», збіраўся вылучыцца кандыдатам у раённы савет, але адмовіўся ад свайго намеру пасля таго, як начальнік раённага аддзела культуры Міхаіл Зайцаў пад пагрозай звальнення запатрабаваў ад яго забраць заяву з выбарчай камісіі», — паведамляе праваабарончы цэнтр «Вясна». Аналагічная сітуацыя была і ў гарадскім пасёлку Свіслач Пухавіцкага раёна — ад удзелу ў выбарчай кампаніі быў вымушаны адмовіцца Яўген Якіменка — малады спецыяліст, сябра АГП. Актывіста аргкамітэта БХД Андруся Кашэўскага, які збіраўся балатавацца ў Жодзінскі гарсавет, пасадзілі на 15 сутак быццам бы за супраціў міліцыі. Аднак прадстаўнікі БХД лічаць, што такім чынам улады наўмысна пазбавілі магчымасці патэнцыйнага апазіцыйнага кандыдата ў дэпутаты мясцовых саветаў своечасова здаць подпісы ў выбаркам дзеля рэгістрацыі.

Ёсць нараканні і на перашкоды падчас збору подпісаў. Звычайна гэта тычыцца забароны на збор подпісаў у інтэрнатах навучальных установаў. Такія прэцэдэнты былі зафіксаваныя ў Віцебску, Магілёве, Гомелі, Салігорску.

Адна з найбольшых праблем выбарчых кампаній такога ўзроўню, і сёлетняй у тым ліку, — нізкая інфармаванасць насельніцтва пра час правядзення выбараў, дый уласна веды, каму і для чаго патрэбнае гэта дэпутацтва. Напрыклад, сябра бабруйскай суполкі БСДП «Грамада» Андрэй Стаселовіч гаворыць, што падчас збору подпісаў у яго склалася ўражанне, што пра выбары ведае толькі кожны дзесяты жыхар горада. У выніку патэнцыйныя кандыдаты ў дэпутаты ды сябры іх ініцыятыўных груп вымушаныя браць на сябе асветніцкую функцыю ды тлумачыць сваім выбарцам, «што гэта за выбары і з чым іх ядуць».

Мясцовыя органы ўлады да 10 сакавіка сфармуюць па ўсёй Беларусі 6 387 участковых выбарчых камісій, у тым ліку 279 — у лячэбных установах і 48 — у воінскіх частках. Пасля зацвярджэння складу камісій яны пачнуць выконваць свае абавязкі: будуць атрымліваць спісы выбаршчыкаў і звяраць іх, зоймуцца абсталяваннем выбарчых участкаў, падрыхтоўкай да галасавання, правядзеннем самога галасавання (датэрміновага, у дзень выбараў і дома) і падвядзеннем вынікаў галасавання па выбарчаму ўчастку.

ЭПАТАЖ

# АДЭПТ БАЙНЭТУ, КЕФІРНЫХ ВОЙНАЎ І СУЧАСНЫХ ПАЛІТТЭХНАЛОГІЙ

Вольга ХВОІН

**Беларускі палітасяродак, бедны на нестандартныя персоны і нетрывіяльныя дзеянні, гэтай зімой ускалыхнуў змагар за абястлушчаны кефір, апрануты ў папаху і чырвоную майку з надпісам «ЗаКолю!», што тонка намякае ці то на супрацьпраўныя дзеянні, ці то на занадта смелы сарказм.**

Вялікую сілу інтэрнэту і прагу народа пабачыць нешта адрознае ад зачытвання сваёй праграмы вядомы ў байнэце блогер Яўген Ліпковіч, які плануе вылучацца ў кандыдаты па Валгаградскай выбарчай акрузе № 54 Мінска на выбарах у мясцовыя саветы, выкарыстоўвае ў сваёй кампаніі ад першага яе этапу. Праз блог была сабрана ініцыятыўная група, праз блог ідзе раскручванне кандыдата і распаўсюд інфармацыі пра акцыі, якія выбіваюцца з традыцыйнага шэрагу спосабаў дайсці да свайго электарату. Дэманстратыўны эпатаж, абсурд і публічнасць — тры кіты, на якіх грунтуецца кампанія ў мясцовыя саветы Ліпковіча.

Яўген Ліпковіч беларускім аматарам пасядзець «ва ўтульнай жж-шчы» вядомы тым, што дамогся вяртання ў сістэму гандлю абястлушчанага кефіру. Усю перапіску з высокімі інстанцыямі на тэму кісламалочнага прадукту Ліпковіч сістэматычна змяшчаў у сваім блогу. З аналагічным пастаянствам ён робіць допісы з фотаздымкамі іранскіх жанчын, задаючы віртуальнаму космасу сакраментальнае для сябе пытанне «іранскія жанчыны — хто яны?».

Цяпер блог кандыдата ў кандыдаты, як сам сябе называе спадар Яўген, пярэсціць інфармацыйнымі матэрыяламі на тэму «хто такі Ліпковіч», чарговымі перапіскамі з адміністрацыямі (увагі вартая хаця б эпапея са спробай далучыць да зацвярджэння свайго агітацыйнага і неадназначнага плаката першага намесніка кіраўніка Адміністрацыі прэзідэнта Наталлю Пяткевіч), справаздачамі самапрэзентацыі ды іранічнымі раскладамі дня яе аўтара. Дарэчы, варта заўважыць, што перадвыбарная праграма кандыдата ў дэпутаты Яўгена Ліпковіча грунтуецца на ідэі абароны сталічнага Севастопальскага парку ад забудовы. Пра пад'езды, «начнікі», дарогі ды іншыя камунальныя і папулярныя ў такіх выпадках тэмы гаворка не вядзецца.

Што тычыцца раскруткі кандыдата ў кандыдаты, то метады самыя што ні ёсць сучасныя і, як можа падацца неспакушанаму ў тонкасцях палітычных кампаній беларускаму выбарцу, правакацыйна-абсурдныя. Напрыклад, у адной са сталічных галерэй была зладжаная аднадзённая выстава падарункаў Яўгену Ліпковічу. Дэманстраваліся «падарункі, уручаныя Ліпковічу асобамі і працоўнымі калектывамі, баявыя трафеі, заваяваныя і запазычаныя прэтэндэнтам у кандыдаты ў розны час і ў розных месцах, артэфакты». 8 сакавіка кандыдат у кандыдаты змясціў у сваім блогу арыгінальнае віншаванне патэнцыйным выбарніцам — каляндар на тыдзень з выявамі самога сябе ў негліжэ. Не менш эпатажны і зварот да мэтавай аўдыторыі: «Сваякі, знаёмыя, палюбоўніцы і палюбоўнікі, прапісаныя ў Валгаградскай выбарчай акрузе № 54, — мне патрэбныя вашы подпісы!» Гумар і самаіронія на мяжы фолу. Цяжка сказаць, наколькі такі падыход апраўданы, але ў плане інфармацыйнай раскруткі ён дзейсны, бо пра нестандартнага кандыдата цяпер ведаюць многія сталічныя інтэрнэт-карыстальнікі, і калі раптам Ліпковіча зарэгіструюць, то, несумнеўна, ладную порцыю галасоў ён атрымае хаця б за тое, што разбавіў аднатыпнасць электаральных кампаній, а беларуская палітыка займела ў яго асобе свайго Жырыноўскага.

Да Ліпковіча складана ставіцца сур'ёзна — усё ж занадта абсурду і эпатажу, хаця варта прызнаць, што ў многім гэта не столькі выдумка, колькі агаленыя факты нашай рэчаіснасці. Хіба што калі доўга жывеш у залюстроўі, то і скажоны свет пачынаеш успрымаць як нармальны і адэкватны. Ці пяройдзе кандыдат у кандыдаты рэгістрацыйны кардон, стане вядома пасля 25 сакавіка, але ў любым выпадку яго кампанія мусіць быць добрым штуршком да роздуму «прафесійным палітыкам», якія страцілі адчуванне патрэбаў і чаканняў людзей, затое добра засвоілі шаблоннасць працы.




Цяпер блог кандыдата ў кандыдаты, як сам сябе называе спадар Яўген, пярэсціць інфармацыйнымі матэрыяламі на тэму «хто такі Ліпковіч»

▸ АЗБУКА ПАЛІТАЛОГІІ

# ПУП БЕЛАРУСЬ

Сяргей НІКАЛЮК

**Пакуль беларусы не аддзеляць мух улады ад катлет уласнасці, яны не змогуць паспяхова канкураваць на рынку нацыянальных праектаў.**



Мяне часта абвінавачваюць, нібыта я схільны разглядаць тое, што адбываецца ў Беларусі, скрозь прызму расійскіх падзей. Не буду адмаўляць, ёсць за мной такі грэх, таму ў якасці своеасаблівай кампенсацыі я вырашыў прысвяціць чарговую «Азбуку паліталогіі» разгляду прынцыповых адрозненняў беларускай прыватызацыі ад расійскай.

На пабытавым узроўні (зрэшты, не толькі на пабытавым) склалася меркаванне, што працэс прыватызацыі ў Беларусі па-сапраўднаму яшчэ і не пачынаўся. У якасці доказу звычайна спасылаюцца на долю дзяржавы ва ўласнасці, якая ніяк не можа апусціцца ніжэй за 80 працэнтаў.

Я прытрымліваюся іншага меркавання. Па хуткасці і эфектыўнасці прыватызацыі Беларусі няма роўных у дружнай сям'і дзяржаў, аб'ядналых абрэвіятурай СНД. Працэс прыватызацыі ў нас быў завершаны ў 1996 годзе, што і замацавана ў Канстытуцыі, адрэдагаванай на лістападаўскім рэферэндуме.

Галоўным пытаннем рэферэндуму 1996 года было пытанне пра прыватызацыю беларускай дзяржавы. Грамадству былі прапанаваныя два прыватызацыйныя праекты: «ПУП Беларусь» (прыватнае унітарнае прадпрыемства) і «ААТ Беларусь» (адкрытае акцыянернае таварыства). Першы варыянт апынуўся па-за канкурэнцыяй. І справа тут не ў своеасаблівым падліку галасоў, як мяркуюць прадстаўнікі прайграўшага боку. Справа ў тым, што рэферэндум толькі замацаваў дэ-юрэ ажыццёўлены да таго часу дэ-факта ПУПаўскі прыватызацыйны праект, складовай часткай якога, дарэчы, з'яўляецца і прыватызацыя прыватнай асобай права вызначаць вынікі выбараў і рэферэндумаў.

У Расіі працэс прыватызацыі дзяржавы расцягнуўся на доўгія гады. Ён канчаткова завяршыўся дзесьці да пачатку другога прэзідэнцкага тэрміну Пуціна. У выніку паўстала «ЗАТ Расія» (закрытае акцыянернае таварыства). У велізарнай краіне з такім складаным унутраным уладкаваннем іншага і не варта было чакаць. ЗАТ азначае, што адны прыватныя асобы прыватызавалі суд, іншыя — Міністэрства ўнутраных спраў і г. д. Найбольш прадпрымальны грамадзянін прыватызаваў нафтавыя і газавыя трубы — дакладней, не самі трубы, а права дапускаць або не дапускаць да іх тых, хто прыватызаваў правa здабываць нафту і газ. У краіне, якая жыве з прыроднай рэнты, права рухаць заслонкі на дзяржаўных трубаправодах аказалася вышэй за іншыя прыватызаваныя правы.

## Два лісты

25 лютага гомельскі актывіст Руху «За Свабоду» Уладзімір Кацора накіраваў у адрас старшыні ЦВК Лідзіі Ярмошынай адкрыты ліст. Працытую першы сказ: «Не так даўно Вы, Лідзія Міхайлаўна, у сродках масавай інфармацыі заявілі, што з'яўляецеся чальцом каманды Лукашэнкі».

Я звярнуўся па дапамогу да пошукавіку ў інтэрнэце і без цяжкасці знайшоў, што прызнанне Ярмошынай накont яе сяброўства ў камандзе Лукашэнкі ўтрымліваецца ў інтэрв'ю «Еўрарадыё». У чым тут фішка? Яна — у артыкуле 32.1 Выбарчага кодэкса. Паводле яго, «асноўнымі прынцыпамі дзейнасці Цэнтральнай камісіі з'яўляюцца законнасць, незалежнасць, калегіяльнасць, адкрытасць і галоснасць».

Для тых, хто не першы год замужам, такое недапасаванне слова і справы афіцыйнай асобы з патрабаваннем закона не павінна выклікаць здзіўлення. Беларускія афіцыйныя асобы ў сваёй практычнай дзейнасці прызвычаіліся «ісці ад жыцця», а не ад законаў. Балазе, ёсць з каго браць прыклад. Усё гэта азбука, і я б не марнаваў час, калі б не другі ліст.

Ён надрукаваны на афіцыйным бланку ЦВК і пачынаецца словамі: *«Господин Кацора! По поводу Вашего обращения, поступившего в мой адрес, сообщаю следующее»...* З дазволу чытачоў, я працытую толькі апошні абзац: *«Мои слова о принадлежности к конкретной «команде» свидетельствуют о наличии служебных отношений в рамках, установленных законом, и человеческом доверии, приобретенном за долгий совместный опыт работы* (выбачайце за нязграбнае вызначэнне, але так у арыгінале — С.Н.). *Полагаю, что по похожим принципам строятся* **корпоративные** *отношения во всем мире».*

Як сказаў адзін далёка не дурны чалавек: «Язык у нашай улады ўладкаваны так, каб служыць прыладай самавыкрыцця». У гэтай сувязі невялікі аўтарскі каментар.

Прыналежнасць старшыні ЦВК да пэўнай «каманды» вызначана ў Канстытуцыі (артыкул 84). Ва ўступнай частцы «Азбукі паліталогіі» я адзначаў, што галоўным пытаннем рэферэндуму 1996 года было пытанне наконт прыватызацыі беларускай дзяржавы, і яно было вырашана на карысць прыватнага унітарнага прадпрыемства (ПУП).

У поўнай адпаведнасці з ПУПаўскім прынцыпам, аднаасобны ўладальнік прадпрыемства сам фармуе сваю каманду. ЦВК — яе частка, створаная для рашэння пэўнай задачы: перыядычнага пераабрання ўладальніка ПУП. Нічога новага ў падобных развагах няма. Чытайце Канстытуцыю, там усё напісана. Новае ж хаваецца ў прызнанні старшыні ЦВК, што беларуская дзяржава з'яўляецца карпарацыяй! Адна справа — алегорыі аналітыка на тэму «беларуская дзяржава = ПУП» і зусім іншае, калі гэта напісана на афіцыйным бланку і заверана адпаведным подпісам.

## Гаспадар у квадраце

Беларуская Канстытуцыя пачынаецца словамі: «Мы, народ Рэспублікі Беларусь... прымаем гэту Канстытуцыю». Выдатныя словы! Хто прымае Канстытуцыю краіны, той і з'яўляецца яе галоўным суб'ектам. У дэмакратычных краінах гэта народ. Калі ж мы праявім пачуццё гістарычнай цікаўнасці і адкрыем, да прыкладу, Канстытуцыю Расійскай імперыі ад 23 красавіка 1906 года, то наконт галоўнага суб'екта даведаемся наступнае: «Императору Усерасійскаму належыць Вярхоўная Самадзяржаўная ўлада. Падпарадкоўвацца ўладзе Яго, не толькі за страх, але і за сумленне, Сам Бог загадвае».

Такім чынам, галоўным суб'ектам дэмакратычнай дзяржавы з'яўляецца народ. Але для таго, каб дэмакратычная дзяржава функцыянавала, патрэбныя «служкі народа», г. зн. чыноўнікі, якіх народ наймае на працу, для чаго






і існуе працэдура выбараў. Але выбарамі ўзаемаадносіны паміж суб'ектам (народам) і аб'ектам (чыноўнікамі) не абмяжоўваюцца. Калі народ пасля выбараў разыдзецца па хатах, бо палічыць сваю суб'ектную місію вычарпанай, то «служкі» вельмі хутка перастворацца ў гаспадароў, і слова гэта давядзецца пісаць без двукосся.

У адрозненне ад дзяржавы, адзіным суб'ектам карпарацыі з'яўляецца яе ўладальнік/уладальнікі. Так уладкаваны ўсе ПУП, ЗАТ і ААТ. Мэтай карпарацыі з'яўляецца атрыманне прыбытку, які пасля выплаты падаткаў паступае ў поўнае распараджэнне ўладальніка/уладальнікаў карпарацыі. Наёмныя ж працаўнікі на прыбытак прэтэндаваць не могуць, умовы аплаты іх працы абумоўленыя ў кантрактах.

Для замацавання тэарэтычнага матэрыялу прапаноўваю ў чарговы раз звярнуцца па дапамогу да інтэрнэтаўскага пошукавіку і набраць словы «Лукашэнка» і «гаспадар». На 11 гадзін раніцы 7 сакавіка Google выдаў роўна 79 тысяч спасылак! Скарыстаемся адной з іх: «У любым калектыве ёсць гаспадар. У вас гаспадар — дзяржава, і вы выяўляеце пункт гледзішча дзяржавы. Гэтага хаваць не трэба», — сказаў Аляксандр Лукашэнка». Растлумачу: «Вы» — гэта працаўнікі Белтэлерадыёкампаніі.

Белтэлерадыёкампанія — карпарацыя дзяржаўная, таму цалкам лагічна, што яе гаспадаром з'яўляецца дзяржава. Але хто гаспадар дзяржавы? Паводле першага абзаца Канстытуцыі — народ. Але, на жаль, беларуская Канстытуцыя першым абзацам не абмяжоўваецца, шмат якія з яе наступных абзацаў, як бы гэта мякчэй сказаць, першы абзац дэзавуююць.

Тут самы час перанесціся ў жнівень 1994 года. З моманту абрання першага беларускага прэзідэнта мінуў месяц. Яму яшчэ шмат што трэба будзе перасэнсаваць з таго, што было абяцана падчас выбарчай кампаніі, але са сваім месцам ва ўладзе ён ужо вызначыўся: «Я проста хачу навесці парадак, хачу, каб быў адзін гаспадар. Я буду гаспадаром, паколькі мяне народ абраў».

Думаю, не шмат хто тады зразумеў, што першая беларуская Канстытуцыя асуджаная. Яна не адпавядала амбіцыям чалавека, што вырашыў стаць гаспадаром гаспадароў (гаспадаром у квадраце).

Чаму жаданне канкрэтнага чалавека стаць гаспадаром у квадраце рэалізавалася? Перачытайце апошнюю цытату яшчэ раз. Уся справа ў народзе, што на свабодных выбарах у 1994 годзе большасцю галасоў падтрымаў кандыдата, які ў найбольшай ступені пасаваў на такую ролю. Сам пераможца любіць паўтараць, што ў другім туры за яго прагаласавала 80 працэнтаў выбарнікаў. Лічба сапраўдная, толькі не трэба забываць пра яўку. Яна ў другім туры склала 56 працэнтаў. У выніку простага арыфметычнага дзеяння мы атрымліваем 44,9 працэнта. Такім чынам, за «ўсенароднаабранага» ў другім туры прагаласавала менш паловы грамадзян рэспублікі.

## Чыкагскія хлопчыкі супраць наргасаўскіх

У любой карпарацыі ўлада і ўласнасць спалучаныя ў адзіную і непадзельную субстанцыю, але ўласнасць у карпарацыі першасная. Абавязковай умовай эфектыўнага функцыянавання сучаснай дзяржавы з'яўляецца размежаванне гэтых базавых панацыяў. Аматары моцнай аўтарытарнай улады любяць спасылацца на станоўчы досвед Пінача. Аднак натхняцца эканамічнымі поспехамі чылійскага дыктатара я б не раіў. Па-першае, таму што на адну паспяховую аўтарытарную мадэрнізацыю прыходзіцца дзесятак няўдалых. Па-другое, Пінача таму і дасягнуў поспеху, што не дазволіў мухам улады паразітаваць на катлетах уласнасці.

У Беларусі паміж мухамі і катлетамі склаўся такі трывалы сімбіёз, што ўжо немагчыма адрозніць, дзе заканчваюцца першыя і пачынаюцца другія. Вось як гэта выглядае ў афіцыйным азначэнні: *«Власть и президент, прежде всего, я уже часто вам об этом говорил, должен контролировать самое главное три вещи: власть — она не приватизируется, собственность и деньги».*

Чаму ж Пінача, захапіўшы ўладу, адмовіўся ад кантролю ўласнасці і грошай? Асноўная прычына — у традыцыі. У Чылі так было і да Пінача. Акрамя таго, нельга забываць пра «чыкагскіх хлопчыкаў», якія склалі аснову яго рэфарматарскай каманды. У адрозненне ад «наргасаўскіх хлопчыкаў», яны выдатна разумелі, што эканоміка і дзяржаўная ўлада дзейнічаюць па розных прынцыпах і правілах.

У эканоміцы пануюць гарызантальныя сувязі, удзельнікі якіх па азначэнні роўныя адзін аднаму. Наадварот, у сферы адказнасці дзяржавы пераважаюць сувязі вертыкальныя. Гэта сфера дзейнасці начальнікаў і падпарадкаваных. Распаўсюджванне сувязяў вертыкальнага тыпу на эканоміку (дзяржаўнае рэгуляванне) абарочваецца яе дэградацыяй. Выкарыстанне ў дзяржаве сувязяў гарызантальнага тыпу (карупцыя) прыводзіць да яе разлажэння. У выніку сімбіёзу мух з катлетамі адбываецца разбурэнне як дзяржава, так і эканомікі. Зразумела, і грамадства пры гэтым не можа заставацца белым і пухнатым.

# ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ

TV

## 15 САКАВІКА, ПАНАДЗЕЛАК

**1**

**06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 23.55** Навіны.
**06.05, 07.10, 08.15** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**07.05, 08.10** Зона X.
**07.30, 08.25, 11.50** Дзелавое жыццё.
**08.30** У свеце матораў.
**09.05** Nota Bene.
**09.35** «Зорныя танцы». Мужчынскі сезон.
**11.00** Серыял «Не нарадзіся прыгожай».
**12.10** Прыгодніцкая камедыя «Рудзі - гончая парася» (Германія).
**14.05** Жаночае ток-шоў «Жыццё як жыццё».
**15.15, 19.15** Навіны рэгіёна.
**15.25** Культурныя людзі.
**15.55** Здароўе.
**16.20** Прэм'ера. Меладраматычны серыял «Агні вялікага горада» (Расія). 1-я серыя.
**17.20** Серыял «Не нарадзіся прыгожай».
**18.25** Відэафільм АТН «Вольга Смаляк» цыклу «Лёгка сказаць».
**18.50, 00.25** «Зона X». Крымінальная хроніка.
**19.25** «КЕНО».
**19.30** «Арэна».
**19.55** Ток-шоў «Ход у адказ».
**21.00** Панарама.
**21.55** Адмысловы рэпартаж АТН «Знайсці кнігу».
**22.05** Драматычны серыял «Доктар Хаўс. Чацвёрты сезон» (ЗША).
**23.05** Фантастычны серыял «Героі-3» (ЗША).
**00.00** «Эпоха». «Вынікі 60-га Берлінскага кінафэсту». Фільм 1-ы.
**00.30** Дзень спорту.

**Н**

**06.00, 06.30, 07.00, 07.30, 08.00, 08.30, 09.00** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.05** Контуры.
**10.10** АНТ прадстаўляе: «Дыханне планеты».
**10.45** АНТ прадстаўляе: «Цудоўная пяцёрка».
**11.00** Нашы навіны.
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** АНТ прадстаўляе: «Цудоўная пяцёрка». Працяг.
**12.00** «Малахаў+».
**13.00** Нашы навіны.
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** «Зразумець. Прабачыць».
**13.40** «Модны прысуд».
**14.45** «Кантрольны закуп».
**15.15** «Віёла Тараканава. У свеце злачыннага запалу». Шматсерыйны фільм.
**16.00** Нашы навіны.
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** Упершыню ў колеры. Легендарнае кіно «Вясёлыя работы».
**18.00** Нашы навіны.
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** Камедыйны серыял «Мая выдатная няня». Пасля вяселля, 2008 год.
**19.00** Чакай мяне.
**20.00** Час.
**20.30** Нашы навіны.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** Ток-шоў «Выбар».
**22.00** «Застацца ў жывых». Шматсерыйны фільм. IV-ы сезон. 6-я серыя.
**23.00** Нашы навіны.
**23.15** Навіны спорту.
**23.20** «Злачынствы стагоддзя».
**23.50** «Жанатыя... з дзецьмі». Шматсерыйны фільм.
**00.35** Нашы навіны.
**00.50** Навіны спорту.

**СТВ**

**06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**06.10** «Міншчына».
**06.20** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**07.40** «СТБ-спорт».
**08.30** «Тыдзень».
**09.35** «Вялікі сняданак».
**10.05** «Пяць гісторый».
**10.40** «Анёл-захавальнік». Тэленавэла.
**11.40** «Званая вячэра».
**12.35** «Былая». Серыял.
**13.50** «Зорны рынг».
**15.00** «Вялікі горад».
**15.40** «Гарачы лёд».
**16.05** «Культурнае жыццё».
**16.50** «Я-вандроўца».
**17.10** «Наша справа».
**17.20** «Міншчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** «Былая». Серыял.
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.20** «Добры вечар, маляня».
**20.40** Фільм «Выпадковы запіс». Украіна.
**22.55** «Сталічны футбол».
**23.25** Фільм «P.S. Я кахаю цябе». 2007 г.

**ЛАД**

**07.00** ЛАДная раніца.
**08.00** Моладзевы серыял «Універ» (Расія).
**08.30** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**09.30** У гэты дзень.
**09.35** Серыял «Каханне як каханне» (Расія).
**10.40** Камедыя «Грай для мяне» (ЗША).
**12.10** «Пра мастацтва».
**12.35** Школа рамонту.
**13.30** Прэм'ера. Дакументальны фільм «Час патрыётаў» («Белвідэацэнтр»).
**14.00** Пазакласная гадзіна.
**14.15** Бухта капітанаў.
**14.55** Тэлебарометр.
**15.15** Дэтэктыўны серыял «Камісар Мегрэ».
**16.20** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**17.20** Простыя практыкаванні з Ю.Афанасьевым (Расія).
**18.00** Серыял «Каханне як каханне» (Расія).
**19.00** Прэм'ера. Дэтэктыўная камедыя «Людзі Шпака» (Расія). 1-я серыя.
**20.05** Моладзевы серыял «Універ» (Расія).
**20.50** Калыханка.
**21.05** Беларуская часіна.
**22.10** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Агляд тура.
**23.05** Хакей. Формула гульні.
**23.35** Дэтэктыўны серыял «Камісар Мегрэ».

**РОССИЯ ТЕЛЕКАНАЛ**

**07.00** «Раніца Расіі».
**09.20** Тэлесерыял «Аднойчы будзе каханне».
**10.10** «Далёкае блізка…». Дакументальны фільм з цыклу «Пецярбург. Гісторыя ў асобах». Дакументальны фільм.
**11.00** Весткі.
**11.25** «Ранішняя пошта».
**11.40** Фільм «Суровыя кіламетры».
**13.20** «Кулагін і партнёры».
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.00** Весткі.
**14.30** «Два бакі адной Ганны». Тэлесерыял.
**15.20** Фільм «Восеньскі дэтэктыў».
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.00** Весткі.
**17.15** «Кулагін і партнёры».
**17.50** Прэм'ера. «Карmеліта. Цыганскі запал». Тэлесерыял. Расія, 2009 г.
**18.50** Навіны - Беларусь.
**19.00** Весткі.
**19.30** Тэлесерыял «Аднойчы будзе каханне».
**20.30** Тэлесерыял «Чэрчыль». Расія, 2009 г.
**22.20** Тэлесерыял «Дворык».
**22.55** «Два бакі адной Ганны». Тэлесерыял.
**23.50** «Нічога асабістага».
**00.05** Навіны - Беларусь.
**00.15** «Весткі+».
**00.20** Прэм'ера. «Гарадок».

**НТВ**

**07.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**07.05** Канал «Сёння раніцай».
**08.25** «Праграма Максімум».
**09.25** «Надзвычайнае здарэнне. Агляд за тыдзень».
**10.20** «Следства вялі…».
**11.10** «Кулінарны паядынак».
**12.05** Дэтэктыўны серыял «МУР ёсць МУР-3».
**13.30** Серыял «Тэрыторыя прыгажосці».
**15.05** «Сярэдні клас».
**15.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.30** Вострасюжэтны серыял «Ганчакі: гонка за лідэрам».
**18.30** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.35** Дэтэктыўны серыял «Глушэц. Працяг».
**21.35** Дэтэктыўны серыял «Ганчакі-2».
**23.15** Сёння.
**23.40** «Сумленны панядзелак».
**00.25** «Школа зласлоўя».

**EUROSPORT**

**09.30** Мотаспартыўны часопіс.
**09.40** Снежны выходны. Агляд. Часопіс.
**10.15** Біятлон. Кубак свету. Жанчыны. Гонка пераследу. Канціалахці (Фінляндыя).
**11.00** Біятлон. Кубак свету. Мужчыны. Гонка пераследу. Канціалахці (Фінляндыя).
**11.45** Скачкі на лыжах з трампліна. Кубак свету. Кваліфікацыя. HS 128. Осла (Нарвегія).
**13.00** Тэніс. Турнір WTA (ЗША). Дзень 5.
**15.30** Веласпорт. Велагонка Парыж-Ніца. Францыя. Этап 7.
**16.00** Веласпорт. Тур Цірэна-Адрыятыка. Італія. Этап 6.
**17.30, 01.00, 01.45** Біятлон. Кубак свету. Мужчыны. Гонка пераследу (Фінляндыя).
**18.00** Скачкі на лыжах з трампліна. Кубак свету. Кваліфікацыя. HS 128. Осла (Нарвегія).
**19.00** Футбол. Еўрагалы. Часопіс.
**19.45** Футбол. Клуб чэмпіёнаў. Часопіс.
**21.15** Футбол. Кубак свету-2010. Прэзентацыя краін-удзельніц. Часопіс.
**21.50** Вось дык так!!!
**22.00** Пра рэстлінг. Агляд WWE.
**22.30** Пра рэстлінг. Vintage Collection. ЗША.
**23.30** Футбол. Клуб чэмпіёнаў. Часопіс.

**БЕЛСАТ tv BELSAT**

**17.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**17.05** Еўропа сёння.
**17.35** «Арол: крымінальная сага», серыял.
**18.35** Госць «Белсату».
**18.55** Гісторыя пад знакам Пагоні.
**19.05** Прэс-экспрэс (агляд медыяў).
**19.20** Англійская мова з Ліпі і Мэсі.
**19.25** «Прыгоды Ціўкі», мультсерыял.
**19.45** Моўнік (лінгвістычная праграма).
**19.50** ПраСвет.
**20.05** Невядомая Беларусь: «Курапаты – шлях сумлення», дак. фільм, 2008 г., Беларусь.
**20.35** Прыватная калекцыя.
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.20** Фільматэка майстроў: «За жменю даляраў», маст. фільм, 1964 г., Італія.
**22.55** Аб'ектыў.

## 16 САКАВІКА, АЎТОРАК

**1**

**06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 23.55** Навіны.
**06.10, 07.10, 08.15** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**07.05, 08.10** Зона X.
**07.30, 08.30, 11.50** Дзелавое жыццё.
**08.35** Арэна.
**09.05** Камедыйны серыял «Сваты» (Украіна).
**09.55** Меладраматычны серыял «Агні вялікага горада» (Расія). 1-я серыя.
**10.50** Серыял «Не нарадзіся прыгожай».
**11.40** Адмысловы рэпартаж АТН «Знайсці кнігу».
**12.10** Вострасюжэтная меладрама «Знак лёсу» (Расія - Украіна).
**14.05** Ток-шоў «Ход у адказ».
**15.15, 19.15** Навіны рэгіёна.
**15.25** Відэафільм АТН «Шум у шафе».
**15.55** Прэм'ера. Меладраматычны серыял «Разлучніца» (Расія) 1-я серыя.
**16.50** Меладраматычны серыял «Агні вялікага горада» (Расія). 2-я серыя.
**17.50** Серыял «Не нарадзіся прыгожай».
**18.50, 00.25** «Зона X». Крымінальная хроніка.
**19.25** «КЕНО».
**19.30** Сфера інтэрэсаў.
**19.55** Камедыйны серыял «Сваты» (Украіна). 3-я серыя.
**21.00** Панарама.
**21.35** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. 1/8 фіналу. Чэлсі - Інтэр.
**00.00** «Эпоха». «Вынікі 60-га Берлінскага кінафэсту». Фільм 2-і.
**00.30** Дзень спорту.
**00.45** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Агляд.

**Н**

**06.00, 06.30, 07.00, 07.30, 08.00, 08.30, 09.00** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.05** Чакай мяне.
**10.00** «Сяргей Юрскі. «Камандаваць парадам буду я!».
**11.00** Нашы навіны.
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** АНТ прадстаўляе: «Адзін супраць усіх».
**12.00** «Малахаў +».
**13.00** Нашы навіны.
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** «Зразумець. Прабачыць».
**13.40** «Модны прысуд».
**14.45** «Кантрольны закуп».
**15.15** «Віёла Тараканава. У свеце злачыннага запалу». Шматсерыйны фільм.
**16.00** Нашы навіны.
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** «Монтэкрыста». Шматсер. фільм.
**17.10** «Хай кажуць».
**18.00** Нашы навіны.
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** Камедыйны серыял «Мая выдатная няня». Пасля вяселля, 2008 год.
**18.55** «Слова жанчыне». Шматсер. фільм.
**20.00** Час.
**20.30** Нашы навіны.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** «Крэм». Шматсерыйны фільм.
**22.05** Прэм'ера. «Сем жонак аднаго халасцяка». Шматсерыйны фільм.
**23.10** Нашы навіны.
**23.25** Навіны спорту.
**23.30** «Зваротны адлік».
**00.00** «Жанатыя... з дзецьмі». Шматсерыйны фільм.
**00.45** Нашы навіны.
**01.00** Навіны спорту.

**СТВ**

**06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**06.10** «Міншчына».
**06.20** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**07.40** «СТБ-спорт».
**08.30** Фільм «Выпадковы запіс». Украіна, 2009 г.
**10.00** «Пяць гісторый».
**10.40** «Анёл-захавальнік». Тэленавэла.
**11.40** «Званая вячэра».
**12.35** «Былая». Серыял.
**13.50** «Гучная справа».
**14.40** «Свая каманда». Моладзевы серыял.
**15.40** «Ваенная таямніца».
**16.50** «Сталічны футбол».
**17.20** «Міншчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** «Былая». Серыял.
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.15** «Добры вечар, маляня».
**20.25** Прэм'ера! «Салдаты. Дзембель непазбежны!» Серыял.
**21.30** «Інструктар». Серыял.
**22.55** «Ля парадната пад'езда».
**23.25** «Аўтапанарама».
**23.45** Фільм «Рызыкоўчы жыццём». ЗША.

**ЛАД**

**07.00** ЛАДная раніца.
**08.00** Моладзевы серыял «Універ» (Расія).
**08.30** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**09.30** У гэты дзень.
**09.35** Серыял «Каханне як каханне» (Расія).
**10.35** Дэтэктыўная камедыя «Людзі Шпака» (Расія). 1-я серыя.
**11.30** «Запал па культуры».
**12.10** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Агляд тура.
**13.05** Хакей. Формула гульні.
**13.30** Кінаспробы.
**13.55** Мультфільм.
**14.05** Мультсерыял «Галактычны футбол».
**14.30** Пазакласная гадзіна.
**14.45** Свая кампанія.
**15.25** Дэтэктыўны серыял «Камісар Мегрэ».
**16.15** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**17.20** Простыя практыкаванні з Ю.Афанасьевым (Расія).
**18.00** Серыял «Каханне як каханне» (Расія).
**19.00** Дэтэктыўная камедыя «Людзі Шпака» (Расія). 2-я серыя.
**20.05** Моладзевы серыял «Універ» (Расія).
**20.50** Калыханка.
**21.05** Беларуская часіна.
**22.10** Спорт-кадр.
**22.40** Хакей. Адкрыты чэмпіянат Беларусі. Паўфінал.
**00.30** Дэтэктыўны серыял «Камісар Мегрэ».

**РОССИЯ ТЕЛЕКАНАЛ**

**07.00** «Раніца Расіі».
**09.20** Тэлесерыял «Аднойчы будзе каханне».
**10.10** «А можа вернемся...». Дакументальны фільм з цыклу «Пецярбург. Гісторыя ў асобах». Дакументальны фільм.
**11.00** Весткі.
**11.25** «Нічога асабістага».
**11.40** Тэлесерыял «Чэрчыль». Расія, 2009 г.
**13.20** «Кулагін і партнёры».
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.00** Весткі.
**14.25** «Два бакі адной Ганны». Тэлесерыял.
**15.15** Тэлесерыял «Служба даверу».
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.00** Весткі.
**17.15** «Кулагін і партнёры».
**17.50** Прэм'ера. «Карmеліта. Цыганскі запал». Тэлесерыял. Расія, 2009 г.
**18.50** Навіны - Беларусь.
**19.00** Весткі.
**19.30** Тэлесерыял «Аднойчы будзе каханне».
**20.30** Тэлесерыял «Чэрчыль». Расія, 2009 г.
**22.20** Тэлесерыял «Дворык».
**22.55** «Два бакі адной Ганны». Тэлесерыял.
**23.50** Навіны - Беларусь.
**00.00** «Весткі+».
**00.20** «Смех скрозь слёзы. Леанід Енгібараў». Дакументальны фільм.

**НТВ**

**07.00** Сёння.
**07.05** Інфармацыйны канал «Сёння раніцай».
**08.25** «Чыстасардэчнае прызнанне».
**08.55** «Прафесія-рэпарцёр».
**09.20** «Іх норавы».
**10.00** Сёння.
**10.20** «Следства вялі…».
**11.10** «Кватэрнае пытанне».
**12.05** Дэтэктыўны серыял «МУР ёсць МУР-3».
**13.00** Сёння.
**13.30** Серыял «Тэрыторыя прыгажосці».
**15.05** «Сярэдні клас».
**15.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.00** Сёння.
**16.30** Вострасюжэтны серыял «Ганчакі: гонка за лідэрам».
**18.30** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.00** Сёння.
**19.35** Дэтэктыўны серыял «Глушэц. Працяг».
**20.35** Дэтэктыўны серыял «Ганчакі-2».
**22.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**23.00** Футбол. Ліга Чэмпіёнаў. Севілля (Іспанія) - ЦСКА (Расія, Масква).

**EUROSPORT**

**09.30** Вось дык так!!!
**09.45** Футбол. Еўрагалы. Часопіс.
**10.30** Футбол. Клуб чэмпіёнаў. Часопіс.
**12.00** Біятлон. Кубак свету. Жанчыны. Гонка пераследу. Канціалахці (Фінляндыя).
**12.30** Біятлон. Кубак свету. Мужчыны. Гонка пераследу. Канціалахці (Фінляндыя).
**13.00** Тэніс. Турнір WTA (ЗША). 1/16 фіналу.
**14.00** Тэніс. Турнір WTA (ЗША). 1/16 фіналу.
**15.30** Веласпорт. Тур Цірэна-Адрыятыка. Італія. Этап 6.
**16.00** Веласпорт. Тур Цірэна-Адрыятыка. Італія. Этап 7.
**17.30** Футбол. Еўрагалы. Часопіс.
**18.15** Футбол. Клуб чэмпіёнаў. Часопіс.
**19.45** Футбол. Еўрагалы. Часопіс.
**20.00** Футбол. Еўрагалы. Навіны.
**20.10** Тэніс. Турнір WTA (ЗША). 1/8 фіналу.
**22.00** Горныя лыжы. Зімовыя паралімпійскія гульні. Ванкувер (Канада).
**00.00** Экстрэмальныя віды спорту. Free Ride Spirit.
**00.15** Скачкі на лыжах з трампліна. Кубак свету. Кваліфікацыя. HS 128. Осла (Нарвегія).
**01.15** Футбол. Еўрагалы. Часопіс.
**02.00** «Еўраспорт за чыстую планету». Часопіс.

**БЕЛСАТ tv BELSAT**

**17.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**17.05** Праект «Будучыня».
**17.30** Жаўтуха (сатырычная праграма).
**18.00** Дакументальная гадзіна: «Рэвалюцыянеры», дак. фільм, 2009 г., Польшча.
**18.55** Тыдзень з радыё «Свабода».
**19.25** Англійская мова з Ліпі і Мэсі.
**19.30** «Прыгоды Ціўкі», мультсерыял.
**19.40** Моўнік (лінгвістычная праграма).
**19.50** «Кроў і попел Дражна», рэпартаж.
**20.15** Акно ў Еўропу.
**20.40** Сальда (эканамічная праграма).
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.20** «Кансультацыя ў ружовым садзе», серыял.
**22.15** Форум (ток-шоў): «Іншамаркі» і людзі».
**22.55** Аб'ектыў.

## 19 САКАВІКА, ПЯТНІЦА

**06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 23.55** Навіны.
**06.05** Дзень спорту.
**06.10, 07.10, 08.15** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**07.05, 08.10** Зона Х.
**07.30, 11.55** Дзелавое жыццё.
**08.35** Сфера інтэрасаў.
**09.05** Камедыйны серыял «Сваты» (Украіна).
**09.55** Меладраматычны серыял «Агні вялікага горада» (Расія). 4-я серыя.
**10.50** Серыял «Не нарадзіся прыгожай».
**11.40** Актуальнае інтэрв'ю.
**12.10** Прыгодніцкая камедыя «Папялушка.ru» (Украіна).
**14.05** Шпілька.
**14.30** «За кулісамі «Залатога шлягера».
**15.15, 19.15** Навіны рэгіёна.
**15.25** Відэафільм АТН «Тэатральны раман».
**15.55** Меладраматычны серыял «Разлучніца» (Расія). 4-я серыя.
**16.50** Жаночае ток-шоў «Жыццё як жыццё».
**18.05** Серыял «Не нарадзіся прыгожай».
**19.25** «КЕНО».
**19.30** «Зона Х». Вынікі тыдня.
**19.55** Камедыйны серыял «Сваты» (Украіна).
**21.00** Панарама.
**21.55** Драматычны серыял «Доктар Хаўс. Чацвёрты сезон» (ЗША).
**23.05** Фантастычны серыял «Героі-3» (ЗША).
**00.00** Трылер «Пяць невядомых» (ЗША).
**01.20** Дзень спорту.

**06.00, 06.30, 07.00, 07.30, 08.00, 08.30, 09.00** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.05** «Слова жанчыне». Шматсер. фільм.
**10.00** «Крэм». Шматсерыйны фільм.
**11.00** Нашы навіны.
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** АНТ прадстаўляе: «Чакай мяне». Беларусь.
**11.50** «Ералаш».
**12.00** «Малахаў +».
**13.00** Нашы навіны.
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** «Зразумець. Прабачыць».
**13.40** «Модны прысуд».
**14.45** «Кантрольны закуп».
**15.15** «Віёла Тараканава. У свеце злачыннага запалу». Шматсерыйны фільм.
**16.00** Нашы навіны.
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** «Монтэкрыста». Шматсер. фільм.
**17.10** «Хай кажуць».
**18.00** Нашы навіны.
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** «Зваротны адлік». «Да ліквідацыі прыступіць».
**18.55** «Поле цудаў».
**20.00** Час.
**20.30** Нашы навіны.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** АНТ прадстаўляе: «Што? Дзе? Калі?» у Беларусі.
**22.25** Фільм «Код апакаліпсісу».
**00.25** Гарык Сукачоў. «5:0 на маю карысць».
**02.00** Нашы навіны.
**02.15** Навіны спорту.

**06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**06.10** «Міншчына».
**06.20** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**07.40** «СТБ-спорт».
**07.45** «Раніца. Студыя добрага настрою»
**08.30** «Салдаты. Дзембель непазбежны!» Серыял.
**09.30** «Аўтапанарама».
**10.00** «Пяць гісторый».
**10.40** «Анёл-захавальнік». Тэленавэла.
**11.30** «Далёкія сваякі».
**11.40** «Званая вячэра».
**12.35** «Былая». Серыял. Заключная серыя.
**13.50** «Сакрэтныя гісторыі».
**14.40** «Свая каманда». Моладзевы серыял.
**15.40** «Водбліскі». Серыял.
**16.50** «Асабісты інтэрас».
**17.20** «Міншчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.35** Фільм «Папялушка ў ботах». Расія.
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.15** «Добры вечар, маляня».
**20.35** Фільм «Вірус кахання».ЗША, 2001 г.
**22.55** «Гарачы лёд».
**23.25** «Відзьмо-невідзьмо». Агляд міжнароднага шоў-бізнэсу.
**00.05** Фільм «Як рыбка без вады». Францыя, 1999 г.
**01.35** «Сакрэтныя матэрыялы». Серыял.

**07.00** ЛАДная раніца.
**08.00** Час футболу.
**08.30** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**09.30** У гэты дзень.
**09.35** Жансавет.
**10.05** Серыял «Каханне як каханне» (Расія).
**11.05** Драма «Да заўтра» (Італія).
**12.50** Гаспадар.
**13.15** Жывы гук.
**14.00** Мультфільм.
**14.20** Мультсерыял «Галактычны футбол».
**15.10** Свая музыка. Працяг.
**15.35** Дэтэктыўны серыял «Камісар Мегрэ» (Францыя-Бельгія-Швейцарыя). Заключная серыя.
**16.25** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**17.30** Усё аб бяспецы.
**18.00** Серыял «Каханне як каханне» (Расія).
**19.00** Пра мастацтва.
**19.30** Рэпарцёр «Беларускай часіны».
**20.20** Калыханка.
**20.40** Бітва экстрасэнсаў.
**21.50** Дакументальны фільм «Хілары Клінтан: жанчына, якая плача» (Расія).
**22.35** Трылер «Незабыўнае» (ЗША).
**00.30** Футбол. Ліга Еўропы. Агляд тура.
**01.25** Тэлепорт.

### РОССИЯ

**07.00** «Раніца Расіі».
**09.20** Тэлесерыял «Аднойчы будзе каханне». Расія, 2009 г.
**10.10** «Мой срэбны шар».
**11.00** Весткі.
**11.25** Тэлесерыял «Чэрчыль». Расія, 2009 г.
**13.15** «Кулагін і партнёры».
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.00** Весткі.
**14.25** Пакой смеху.
**15.15** Тэлесерыял «Служба даверу».
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.00** Весткі.
**17.15** «Кулагін і партнёры».
**17.45** Прэм'ера. «Кармеліта. Цыганскі запал». Тэлесерыял. Расія, 2009 г.
**18.50** Навіны - Беларусь.
**19.00** Весткі.
**19.30** Прэм'ера. Тэлесерыял «Аднойчы будзе каханне». Расія, 2009 г.
**20.30** Тэлесерыял «Дворыкі».
**20.30** «Юрмала». Фэст гумарыстычных праграм.
**22.20** Навіны - Беларусь.
**22.30** Фільм «Шчасце па рэцэпце», Расія.
**00.35** Фільм «Дваццаць дзён без вайны».

### НТВ

**07.00** Сёння.
**07.05** Інфармацыйны канал «Сёння раніцай».
**08.30** «Алтар Перамогі».
**09.20** «Асабліва небяспечны!».
**10.00** Сёння.
**10.20** «І зноў добры дзень!».
**11.15** Дэтэктыўны серыял «МУР ёсць МУР-3» (2 серыі).
**13.00** Сёння.
**13.30** Прэм'ера. Меладрама «Дом з сюрпрызам «.
**15.00** «Сярэдні клас».
**15.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.00** Сёння.
**16.30** Вострасюжэтны серыял «Кодэкс гонару».
**18.30** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.00** Сёння.
**19.35** Дэтэктыўны серыял «Глушэц. Працяг».
**20.35** «Надзвычайнае здарэнне. Расследаванне».
**21.00** Прэм'ера. «Нтвшнікі. Папса: навошта мы гэта слухаем?».
**22.10** Прэм'ера. «Таблеткі ад старасці».
**23.20** Трылер «Дарога смерці».

### EUROSPORT

**09.30** «Прыгоды. Абу-Дабі (ААЭ)». Часопіс.
**10.00** Скачкі на лыжах з трампліна. Кубак свету. HS 215. Кваліфікацыя. Планіца (Славенія).
**11.00** Біятлон. Кубак свету. Жанчыны. Спрынт. Осла (Нарвегія).
**12.00** Біятлон. Кубак свету Мужчыны. Спрынт. Осла (Нарвегія).
**13.00** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Лёсаванне.
**13.30** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Аналіз лёсавання.
**14.00** Футбол. Ліга Еўропы. Лёсаванне.
**14.30** Лыжныя гонкі. Кубак свету. Мужчыны. 5 км. Фалун (Швецыя).
**15.15** Лыжныя гонкі. Кубак свету. Жанчыны. 5 км. Гонка пераследу вольным стылем. Фалун (Швецыя).
**16.00** Скачкі на лыжах з трампліна. Кубак свету. HS 215. Планіца (Славенія).
**18.00** Канькабежны спорт. Чэмпіянат свету. Херэнвен (Нідэрланды).
**19.00** Лыжныя гонкі. Кубак свету. Мужчыны. 5 км. Фалун (Швецыя).
**19.30** Лыжныя гонкі. Кубак свету. Жанчыны. 5 км. Гонка пераследу вольным стылем. Фалун (Швецыя).
**20.00** Футбол. Еўрагалы. Навіны.
**20.10** Тэніс. Турнір WTA (ЗША). 1/4 фіналу.
**21.00** Тэніс. Турнір WTA (ЗША). 1/2 фіналу.
**22.45** Горныя лыжы. Зімовыя паралімпійскія гульні. Слалам-гігант. Ванкувер (Канада).
**00.00** Самыя моцныя людзі планеты. Ліга чэмпіёнаў. Украіна. Фінал.
**01.00** Экстрэмальныя віды спорту. Часопіс.
**01.30** Экстрэмальныя віды спорту. Free Ride Spirit.
**01.45** Скачкі на лыжах з трампліна. Кубак свету. HS 215. Планіца (Славенія).

### БЕЛСАТ tv BELSAT

**17.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**17.05** На колах.
**17.35** «Элі Макбіл», тэлесерыял.
**18.20** Форум (ток-шоу): «Кесару – кесарава: падаткі ў Беларусі».
**19.00** Гісторыя пад знакам Пагоні (спазнаваўчая праграма).
**19.05** Маю права (прававаая праграма).
**19.25** Англійская мова з Ліпі і Мэсі.
**19.30** «Прыгоды Ціўкі», мультсерыял.
**19.40** Невядомая Беларусь: «Беларусь пад нямецкай акупацыяй», дак. фільм, 2009 г., Польшча, ч. 2.
**20.20** «Алесь Бяляцкі – абаронца правоў чалавека».
**20.40** Госць «Белсату».
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.20** «Татулі», камедыя, 1983 г., Францыя.
**22.50** Аб'ектыў.

## 20 САКАВІКА, СУБОТА

**06.35** Дакументальна-пазнавальны серыял «Серферы» (Францыя).
**07.05** Існасць.
**07.30** Дзень спорту.
**07.40** Дзённік «Мінск - Вена-2010».
**07.55** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**09.00, 12.00, 15.00** Навіны.
**09.05** Здароўе.
**09.40** Дэтэктыўны серыял «Шпікі раённага маштабу-2» (Расія).
**10.30** Шпілька.
**11.05** Ранішняя хваля.
**11.45** «OFF STAGE LIFE».
**12.10** «Прыгоды Шэрлака Холмса і доктара Ватсана» (СССР). Фільмы «Кароль шантажу» і «Смяротная сутычка».
**14.35** «Зона Х». Вынікі тыдня.
**15.10** Навіны рэгіёна.
**15.30** Вакол планеты.
**16.10** Алімпійскі часопіс.
**16.30** Дакументальны цыкл «Фартыфікацыя» (Беларусь).
**17.10** Відэафільм АТН « Фаворскае свята жабінкаўскіх знічак» цыклу «Зямля беларуская».
**17.25** Відэафільм АТН «Прабач мяне».
**17.55** «Ваша лато».
**18.45** Латарэя «Пяцёрачка».
**19.00** Навіны.
**19.25** «КЕНО».
**19.30** Зорныя танцы. Мужчынскі сезон.
**21.00** Панарама.
**21.40** Прэм'ера. Трагікамедыя «Я абслугоўваў англійскага караля» (Чэхія-Славакія).
**23.50** Уласны персонал.

**07.00** АНТ прадстаўляе: «Суботняя раніца».
**08.00, 09.00** Нашы навіны.
**09.05** Камедыйны серыял «Хто ў хаце гаспадар?», 2005 год.
**09.45** «Здароўе».
**10.30** «Смак».
**11.10** Асяроддзе пасялення.
**12.10** Анімацыйны фільм «Геркулес».
**13.50** АНТ прадстаўляе: Тэлечасопіс «Звяз».
**14.20** «Кінаметры вайны».
**14.50** Мастацкі фільм «Крокі па зямлі».
**16.00** Нашы навіны.
**16.15** Навіны спорту.
**16.20** «Мой радавод».
**17.20** Фільм «Хлопец з бурбалкі».
**18.55** АНТ прадстаўляе: «Адзін супраць усіх».
**19.55** АНТ прадстаўляе: «Чакай мяне». Беларусь.
**20.30** Нашы навіны.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** Прэм'ера. Шматсерыйны фільм «Прапанаваныя абставіны».
**23.15** «Пражэктарпэрысхілтан».
**23.55** Тэорыя неверагоднасці.
**00.35** АНТ прадстаўляе: Прафесійны бокс.

**07.00** «Агенцтва 2». Камедыйны серыял.
**07.50** Фільм «Горад майстроў». СССР, 1965 г.
**09.10** «Дабро пажаліцца».
**09.30** «Культурнае жыццё».
**10.00** «Крокі да поспеху».
**10.55** «Мінск і мінчане».
**11.30** «Салдаты. Залатыя серыі».
**13.15** «Новыя падарожжы дылетанта».
**13.45** «Фантастычныя гісторыі».
**14.25** Фільм «Супрацьстаянне». СССР, 1985 г.
**15.45** «Відзьмо-невідзьмо». Агляд міжнароднага шоў-бізнэсу.
**16.30** «24 гадзіны».
**16.45** «Наша справа».
**17.00** «Вялікі горад».
**17.45** Фільм «Хімія пачуццяў». Украіна, 2008 г.
**19.30** «24 гадзіны».
**20.00** «СТБ-спорт».
**20.10** «Зорны рынг».
**21.25** Фільм «Братэрства Ваўка».Францыя, 2000 г.
**23.55** Фільм «Монстр». Германія-ЗША, 2003 г.
**01.40** «Сакрэтныя матэрыялы». Серыял.

**07.40** Кулінарная праграма «Смачна з Барысам Бурдой».
**08.15** Усё аб бяспецы.
**08.45** Тэлепорт.
**09.10** Дакументальны фільм «Хілары Клінтан: жанчына, якая плача» (Расія).
**10.00** Нашы тэсты.
**10.40** Жансавет.
**11.15** Свая кампанія.
**12.05** Лабірынты: Лявон Вітан-Дубейкаўскі.
**12.35** «Запал па культуры».
**13.15** Прэм'ера! Серыял «Пярсцёнак з бірузой» (Украіна). 1-я і 2-я серыі.
**15.10** Біятлон. Кубак свету. Гонка пераследу. Жанчыны. Прамая трансляцыя.
**16.00** Дакументальны цыкл «Неверагодныя гісторыі кахання» (Украіна).
**16.55** Біятлон. Кубак свету. Гонка пераследу. Мужчыны. Прамая трансляцыя.
**17.45** «Зоркі гумару». Гумарыстычная праграма (Расія).
**18.50** Прэм'ера! Камедыя «Парыжскае каханне Косці Гуманкова» (Расія).
**20.40** Гістарычная драма «Гняздо жаўрука» (Італія - Францыя - Вялікабрытанія).
**23.00** Жывы гук.
**23.40** Казанова.

### РОССИЯ

**07.00** Весткі.
**07.15** «Юрмала». Фэст гумарыстычных праграм.
**08.50** Фільм «Памятаць або забыцца».
**10.25** «Ранішняя пошта».
**11.00** Весткі.
**11.10** «Суботнік».
**11.50** Фільм «Шчасце па рэцэпце», Расія.
**14.00** Весткі.
**14.15** Фільм «Дваццаць дзён без вайны».
**16.10** Прэм'ера. «Зорка Барыса Штокалава».
**17.00** «Суботні вечар».
**19.00** Весткі ў суботу.
**19.45** «Гарадок». Дайджэст.
**20.20** Прэм'ера. Фільм «Завея». Расія, 2010 г.
**23.55** Дэтэктыў «Чорны квадрат».

### НТВ

**07.35** «Казкі Бажэнава».
**08.00** Сёння.
**08.20** «Авіятары».
**08.50** «Агляд».
**09.25** «Без рэцэпту».
**10.00** Сёння.
**10.25** «Галоўная дарога».
**10.55** «Кулінарны паядынак».
**11.55** «Кватэрнае пытанне».
**13.00** Сёння.
**13.20** «Жаночы погляд».
**14.10** Рамантычная камедыя «Так яна знайшла мяне».
**16.00** Сёння.
**16.20** Прэм'ера. Дэтэктыўны серыял «Адвакат».
**17.20** «Вочная стаўка».
**18.25** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.00** Сёння.
**19.30** «Прафесія-рэпарцёр».
**20.05** «Праграма Максімум».
**21.10** «Руская сенсацыі».
**22.10** «Ты не паверыш!».
**23.05** Крымінальная камедыя «Пасля чытання спаліць».
**00.50** Трылер «Паўсвятло».

### EUROSPORT

**09.30** Лыжныя гонкі. Кубак свету. Жанчыны. 5 км. Гонка пераследу вольным стылем. Фалун (Швецыя).
**10.00** Лыжныя гонкі. Кубак свету. Мужчыны. 5 км. Фалун (Швецыя).
**10.30** Скачкі на лыжах з трампліна. Кубак свету. HS 215. Планіца (Славенія).
**11.15** Скачкі на лыжах з трампліна. Кубак свету. HS 215. Планіца (Славенія).
**13.00** Лыжныя гонкі. Кубак свету. Жанчыны. 5 км. Гонка пераследу вольным стылем. Фалун (Швецыя).
**13.30** Лыжныя гонкі. Кубак свету. Мужчыны. 5 км. Фалун (Швецыя).
**14.15** Лыжныя гонкі. Кубак свету. Жанчыны. Гонка пераследу. Фалун (Швецыя).
**14.45** Скачкі на лыжах з трампліна. Кубак свету. HS 215. Планіца (Славенія).
**15.15** Біятлон. Кубак свету. Жанчыны. Гонка пераследу. Осла (Нарвегія).
**16.00** Лыжныя гонкі. Кубак свету. Мужчыны. Гонка пераследу. Фалун (Швецыя).
**17.00** Веласпорт. Велагонка Мілан - СанРэма. Італія.
**18.15** Біятлон. Кубак свету. Мужчыны. Гонка пераследу. Осла (Нарвегія).
**19.00** Лыжныя гонкі. Зімовыя паралімпійскія гульні. Ванкувер (Канада).
**19.30** Біятлон. Кубак свету. Жанчыны. Гонка пераследу. Осла (Нарвегія).
**20.00** Скачкі на лыжах з трампліна. Кубак свету. HS 215. Планіца (Славенія).
**21.00** Лыжныя гонкі. Зімовыя паралімпійскія гульні. Ванкувер (Канада).
**22.00** Хакей на лёдзе. Зімовыя паралімпійскія гульні. Ванкувер (Канада). Фінал.
**23.10** Веласпорт. «Планета Армстронг». Часопіс.
**23.15** Кёрлінг. Чэмпіянат свету. Жанчыны. Першы круг. Кітай - Германія. Свіфт-Карэнт (Канада).
**01.00** Ралі. Ралійная серыя IRC. Аргентына. Дзень 1.
**01.30** Баявыя мастацтвы. Байцоўскі клуб. Dynamite/Slamm 6 Галандыя.

### БЕЛСАТ tv BELSAT

**17.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**17.05** Еўропа сёння (тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»).
**17.35** «Элі Макбіл», тэлесерыял.
**18.20** «Бульбаны», мультсерыял.
**18.30** Аблічча таталітарызму: «Расія. XX стагоддзе. Позірк на ўладу», 2009 г., Расія: ч. 1 і 2
**19.25** Англійская мова з Ліпі і Мэсі.
**19.30** «Прыгоды Ціўкі», мультсерыял.
**19.40** ПраСвет (інфармацыйна-публіцыстычная праграма).
**20.00** «Мой Кесьлёўскі», дак. фільм, 2005 г., Польшча–Расія.
**20.25** Тыдзень з радыё «Свабода» (аналітычная праграма).
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.10** Суботні сеанс: «Развод», маст. фільм, 2003 г., Германія–ЗША.
**22.45** Аб'ектыў.

# ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ



## 21 САКАВІКА, НЯДЗЕЛЯ

### 1

**07.35** Фільм-казка «Агонь, вада і ... медныя трубы» (СССР).
**09.00** Навіны.
**09.05** «Арсенал».
**09.35** «Зброя». Цыкл дакументальных фільмаў (Беларусь).
**09.50** Альманах вандраванняў.
**10.15** Культурныя людзі.
**10.55** У свеце матораў.
**11.25** Nota Bene.
**12.00** Навіны.
**12.10** «Прыгоды Шэрлака Холмса і доктара Ватсана» (СССР). Фільм «Паляванне на тыгра».
**13.35** «За кулісамі «Залатога шлягера».
**14.00** Хранікальна-дакументальны цыкл «Гарачыя кропкі» (Беларусь).
**14.30** Футбол. Ліга чэмпіёнаў. Відэачасопіс.
**15.00** Навіны.
**15.10** Навіны рэгіёна.
**15.30** Відэафільм АТН «У гасцях у швецкага караля. Стакгольм».
**15.55** Камедыйная меладрама «Сеньёр 15 шароў» (Італія).
**18.00** Суперлато.
**19.00** Навіны.
**19.15** Дакументальна-біяграфічны цыкл «Мая праўда» (Украіна).
**20.30** «Спортлато 5 з 36». Забаўляльнае шоў.
**20.50** «КЕНО».
**21.00** «У цэнтры ўвагі».
**22.10** Псіхалагічны трылер «Шпік» (ЗША).

### Н

**07.00** АНТ прадстаўляе: «Нядзельная раніца».
**08.00, 09.00** Нашы навіны.
**09.05** Нядзельная пропаведзь.
**09.20** Камедыйны серыял «Хто ў хаце гаспадар?», 2005 год.
**09.55** «Шалапутныя нататкі».
**10.15** Пакуль усе дома.
**11.05** Прэм'ера «Шчасце ёсць!».
**12.00** АНТ прадстаўляе: «Ранішняя пошта».
**12.35** «Фазэнда».
**13.15** «Разумніцы і разумнікі».
**14.00** Нядзельны «Ералаш».
**14.35** «Песні Перамогі».
**15.05** Прэм'ера. Севастопальскія аповяды. «Крымскія вакацыі Кацярыны Вялікай».
**16.00** Нашы навіны.
**16.15** Навіны спорту.
**16.20** Прэм'ера. «Чатыры міфы аб здаровым ладзе жыцця».
**17.20** Прэм'ера. «Песні на дваіх. Леў Лешчанка і Вячаслаў Дабрынін».
**18.55** Прэм'ера АНТ: «Давай ажэнімся!».
**20.00** Контуры.
**21.05** АНТ прадстаўляе: «Дыханне планеты».
**21.40** «Клуб Вясёлых і Знаходлівых». Вышэйшая ліга.
**23.50** Драма «Паядынак».

### СТВ

**07.10** «Агенцтва 2». Камедыйны серыял.
**08.00** Фільм «Вірус кахання».ЗША, 2001 г.
**09.30** «Аўтапанарама».
**10.00** «Відавочнік прадстаўляе: самае смешнае».
**10.50** «Вялікі сняданак».
**11.30** «Салдаты. Залатыя серыі».
**13.15** «Добры дзень, доктар!».
**13.45** «Дарагая перадача».
**14.05** Фільм «Супрацьстаянне». СССР, 1985 г. Заключныя серыі.
**16.30** «24 гадзіны».
**16.50** «Ля парадняга пад'езда».
**17.20** «Прыватныя гісторыі».
**18.10** «Мітрапаліт Філарэт: служэнне Царкве і Айчыне». Дакументальны фільм.
**19.00** «Аўтапанарама».
**19.30** «Тыдзень». Інфармацыйна-аналітычная праграма.
**20.40** Фільм «Каханне і танцы».ЗША, 2009 г.
**22.30** «Прафесійны бокс».
**23.35** Фільм «Скафандр і матыль «. ЗША-Францыя, 2007 г.
**01.25** «Сакрэтныя матэрыялы». Серыял.

### ЛАД

**07.05** Дабравест.
**07.30** Мір вашай хаце.
**07.40** Кулінарная праграма «Смачна з Барысам Бурдой».
**08.05** Камедыя «Парыжскае каханне Косці Гуманкова» (Расія).
**09.55** Школа рамонту.
**11.00** Медычныя таямніцы.
**11.45** Кінаспробы.
**12.05** Бухта капітанаў.
**12.45** «Правы чалавека».
**13.00** Серыял « Пярсцёнак з бірузой « (Украіна). 3-я і 4-я, заключная, серыі.
**15.10** Біятлон. Кубак свету. Гонка з масавым стартам. Жанчыны. Прамая трансляцыя.
**16.10** Нашы тэсты.
**16.55** Біятлон. Кубак свету. Гонка з масавым стартам. Мужчыны. Прамая трансляцыя.
**17.45** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Манчэстэр Юнайтэд - Ліверпуль.
**19.45** Экспедыцыя.
**20.15** Тэлебарометр.
**20.35** Смешная часіна.
**21.15** Крымінальная камедыя «Маўчы ў анучку» (Вялікабрытанія).
**23.10** Свая музыка. Працяг.
**23.40** Пасоўванне+.

### РОССИЯ

**07.00** «Здабытак рэспублікі».
**07.40** Фільм «Завея». Расія, 2010 г.
**11.00** Весткі.
**11.10** «Сам сабе рэжысёр».
**12.10** Меладрама «Адзін радок».
**14.00** Весткі.
**14.15** «Смехапанарама Яўгенія Петрасяна».
**14.50** «Чалавек без маскі. Георг Отс». Дакументальны фільм.
**15.35** Камедыя «Яна вас кахае?».
**17.15** Прэм'ера. «Ізмайлаўскі парк». Вялікі гумарыстычны канцэрт.
**19.00** Весткі тыдня.
**20.05** «Сумленны дэтэктыў»..
**20.40** Прэм'ера. «Танцы з Зоркамі». Сезон - 2010.
**23.10** «Адмысловы карэспандэнт».
**00.15** Фільм «Рассмяшыць Бога». Расія, 2006 г.
**01.50** Заканчэнне эфіру.

### НТВ

**06.10** Крымінальная камедыя «Пасля чытання спаліць».
**07.40** Мультфільм.
**08.00** Сёння.
**08.20** «Дзікі свет».
**08.45** «Іх норавы».
**09.20** «Ямо дома!».
**10.00** Сёння.
**10.20** «Выратавальнікі».
**10.50** «Асабліва небяспечны!».
**11.30** «Першая кроў».
**12.00** «Дачны адказ».
**13.00** Сёння.
**13.20** «Следства вялі…».
**14.15** Камедыя «Кракадзіл Дандзі ў Лос-Анжэлесе».
**16.00** Сёння.
**16.20** Прэм'ера. Дэтэктыўны серыял «Адвакат».
**17.20** «І зноў добры дзень!».
**18.25** «Надзвычайнае здарэнне. Агляд за тыдзень».
**19.00** Сёння. Выніковая праграма.
**19.55** «Чыстасардэчнае прызнанне».
**20.30** Прэм'ера. Дэтэктыўны серыял «Брудная праца».
**00.05** «Авіятары».
**00.30** «Футбольная ноч».

### EUROSPORT

**09.30** Ралі. Ралійная серыя IRC. Аргентына. Дзень 1.
**10.00** «Еўраспорт за чыстую планету». Часопіс.
**10.30** Скачкі на лыжах з трампліна. Кубак свету. HS 215. Планіца (Славенія).
**11.15** Скачкі на лыжах з трампліна. Кубак свету. HS 215. Каманды. Планіца (Славенія).
**13.00** Лыжныя гонкі. Кубак свету. Жанчыны. Гонка пераследу. Фалун (Швецыя).
**13.30** Лыжныя гонкі. Кубак свету. Мужчыны. Гонка пераследу. Фалун (Швецыя).
**14.15** Лыжныя гонкі. Кубак свету. Жанчыны. 10 км вольным стылем. Фалун (Швецыя).
**15.00** Біятлон. Кубак свету. Жанчыны. Масстарт. Осла (Нарвегія).
**16.00** Лыжныя гонкі. Кубак свету. Мужчыны. 15 км вольным стылем. Фалун (Швецыя).
**17.00** Біятлон. Кубак свету. Мужчыны. Масстарт. Осла (Нарвегія).
**17.40** Снежны выходны. Агляд. Часопіс.
**17.45** Кёрлінг. Чэмпіянат свету. Жанчыны. Першы круг. Шатландыя - Германія. Свіфт-Карэнт (Канада).
**19.30** Канькабежны спорт. Чэмпіянат свету. Херэнвен (Нідэрланды).
**20.30** Тэніс. Турнір WTA (ЗША). Фінал.
**23.00** Горныя лыжы. Зімовыя паралімпійскія гульні. Слалам. Ванкувер (Канада).
**00.00** Біятлон. Кубак свету. Жанчыны. Масстарт. Осла (Нарвегія).
**00.30** Біятлон. Кубак свету. Мужчыны. Масстарт. Осла (Нарвегія).
**01.00** Ралі. Ралійная серыя IRC. Аргентына. Дзень 2.
**01.30** Скачкі на лыжах з трампліна. Кубак свету. HS 215. Каманды. Планіца (Славенія).
**02.30** Снежны выходны. Агляд. Часопіс.

### БЕЛСАТ tv

**17.00** Прэс-экспрэс (агляд медыяў).
**17.20** «Арол: крымінальная сага», серыял.
**18.15** Дакументальная гадзіна: «Сістэма», дак. фільм, 2008 г., Германія–Італія–Канада–Эстонія.
**19.25** Англійская мова з Ліпі і Мэсі.
**19.30** «Прыгоды Ціўкі», мультсерыял.
**19.40** «Геніяльны аматар», дак. фільм, 2008 г., Румынія.
**20.30** Акно ў Еўропу (інфармацыйная праграма).
**21.00** Тыдзень у «Аб'ектыве».
**21.30** Фільматэка майстроў: «Пінжак», маст. фільм, 2005 г., ЗША.

---

# Шаноўныя чытачы!

**Газета «Новы час» працягвае падпіску. Падпісацца можна на перыяд ад 1 месяца да 1 года праз пошту або праз банк.**

## Падпіска на «Новы час» праз пошту

1. Выразаем купон.
2. На ПАШТОВЫМ ПЕРАВОДЗЕ пішам суму грашовага пераводу ў лічбах і прапісам.
3. У графе «Ад каго» пішам прозвішча, імя, імя па бацьку.
4. Ніжэй указваем адрас.
5. Ідзем на бліжэйшае паштовае аддзяленне і здзяйсняем паштовы перавод.
6. Ксеракопію плацёжнага дакумента, атрыманага вамі, з указаннем тэрміну падпіскі і адрасам дастаўкі накіроўваем у рэдакцыю.
7. Кошт падпіскі за адзін нумар — 500 рублёў (на адзін месяц — 2000 рублёў).

БЕЛПОЧТА

ф. ПС 112

**ЭЛЕКТРОННЫЙ ДЕНЕЖНЫЙ ПЕРЕВОД**

№ ______ (вход, по карте отправки)

ВЫРУЧКА ☐ НАЛОЖЕННЫЙ ПЛАТЕЖ ☐

(сумма цифрами) (сумма прописью)

ПОЛУЧАТЕЛЬ___ Г-та «Новы час», р/с 3012211080010 фил. МГД ОАО «Белинвестбанк», код 153001764, УНН 190790926

КУДА 220004, г. Минск, ул. Коллекторная, 11

почтовый код, адрес получателя, телефон)

ОТПРАВИТЕЛЬ ______

почтовый код, адрес отправителя, телефон)

АДРЕС ______

Доставка ☐ уведомление ☐ простое ☐ заказное ☐ электронное

(назначение платежа)

(письменное сообщение)

Отметки отделения почтовой связи места приема:
(почтовый код, оттиск контрольно-переводной печати, кол. шт.)
№ перевода по ф. 5 ______________
Время приема _______ ч. _____ мин.
Подпись

## Падпіска на «Новы час» праз банк

1. Выразаем купон.
2. Пішам прозвішча, імя, імя па бацьку і адрас.
3. Указваем суму аплаты.
4. Ідзем у адзяленне банка і здзяйсняем пералік грошай.
5. Ксеракопію плацёжнага дакумента, атрыманага вамі, з указаннем тэрміну падпіскі і адрасам дастаўкі накіроўваем у рэдакцыю.
6. Кошт падпіскі за адзін нумар — 500 рублёў (на адзін месяц — 2000 рублёў).

КВИТАНЦИЯ

ЧИУП «Час навінаў»
(получатель платежа)
МГД ОАО «Белинвестбанк» г. Минск
(наименование банка)

Счет получателя 3012211080010 Лицевой счет Код 764

УНП* 190790926

(фамилия, имя, отчество, адрес)

| Вид платежа | | | Дата | Сумма |
|---|---|---|---|---|
| Период подписки указывает абонент | | | | |
| | | | | |

Плательщик

Пеня ______

Кассир Всего ______

**Для тых, хто прымае рашэнні!**

Новы час

www.novychas.org

НАВУКА І ПАЛІТЫКА

# ХРАМАСОМЫ І НАЦЫЯНАЛІЗМ

Алег ПЯТРОЎ

**Іспанскія вучоныя спрабуюць аспрэчыць тэорыю нацыяналістаў з Краіны Баскаў пра існаванне асобнай басккай расы.**

Нагадаю, баскі — народ, які насяляе землі на поўначы Іспаніі і на паўднёвым захадзе Францыі. Іх — каля 3 мільёнаў. Баскская мова — адзіная ў Еўропе, якая не належыць да сям'і індаеўрапейскіх моў.

Існуе цэлы спектр версій пра паходжанне гэтага народа. Ёсць вельмі смелыя і арыгінальныя: баскі прыйшлі з Грузіі або былі вікінгамі. Ёсць больш празаічныя: страдаўнія баскі былі кельтамі, берберамі (жыхары Паўночнай Афрыкі), людзьмі часоў палеаліту, якія хаваліся ў пячэрах Іберыі ад пахаладання.

Самі мясцовыя нацыяналісты лічаць, што баскская мова і народ узніклі без нейкіх асаблівых вонкавых уплываў. Нацыя і мова існавалі тут спакон вякоў. Потым, прыкладна 10 тысяч гадоў да нашай эры, сюды прыйшлі прашчуры цяперашніх іспанцаў. Апошняе дае баскам гістарычнае права называць сябе абарыгенамі, а іспанцаў — акупантамі.

Акрамя таго, піянеры баскскага нацыяналізму цвердзяць, што іх народ выконвае нейкую асаблівую метафізічную місію. Вялікая роля ў баскскім грамадстве належыць касцёлу. А той факт, што менавіта на землях баскаў у сярэднявечныя часы быў спынены паход мусульман на Еўропу, дае ім падставу казаць, што баскі — абраны Богам народ. Адсюль вынікае тэзіс пра неабходнасць захавання мовы, культуры і, нарэшце, генафонду нацыі.



Сапраўдная рэвалюцыя ў тэорыі баскскай расы адбылася ў 1949 годзе, калі Артур Муран, брытанскі генетык, давёў, што баскі на генетычным узроўні адрозніваюцца ад еўрапейскіх народаў. У баскаў адмоўны рэзус-фактар крыві сустракаецца значна часцей, чым у іспанцаў. Іншыя пазнейшыя даследаванні пацвердзілі высновы Мурана.

Генетычная адрознасць баскаў ад іспанцаў стала дадатковым аргументам для баскаў, каб патрабаваць палітычнай незалежнасці ад Мадрыду. Некаторыя нацыяналісты патрабавалі прыняцця кодэксу нацыяналіста, які забараняў баскам дзеля чысціні і захавання расы браць шлюбы з прадстаўнікамі іншых народаў.



Так ці інакш, сучасная навука спрабуе давесці, што Муран памыляўся. На днях Human Genetics, саліднае медычнае выданне, паведаміла пра вынікі даследавання аднаго з дэпартаментаў барселонскага універсітэта. Іх выснова: «баскі не могуць лічыць сябе асобнай нацыяй Еўропы». «Тэорыі наконт існавання баскскай расы павінны быць перагледжаныя», — заявіў кіраўнік групы вучоных. Дарэчы, гэты кіраўнік пачынаў свае навуковыя пошукі, калі быў баскскім нацыяналістам, менавіта з мэтай давесці генетычную арыгінальнасць баскаў.

Галоўная памылка Мурана, на думку вучоных з Барселоны, заключаецца ў вузкасці ягонага падыходу. Акрамя аналізу рэзус-фактара крыві існуе шмат іншых характарыстык геннай сістэмы асобы і калектыву. Сучасная навука, калі верыць Human Genetics, ведае некалькі тысяч генных характарыстык чалавека, каб казаць пра сапраўдную адметнасць баскаў ад суседзяў, аднаго рэзусу мала.

Дзеля праверкі версіі Мурана вучоныя адабралі 144 чалавекі з розных рэгіёнаў Іспаніі, Паўночнай Афрыкі, Францыі і, натуральна, Краіны Баскаў. Іспанскую дзяржаву падзялілі на дзесяць зонаў. У кожнай зоне знайшлі 30 чалавек, у якіх дзядулі і бабулі былі з гэтых месцаў. Ва ўсіх узялі аналізы геннай структуры, ахарактарызавалі іх па 300 параметрах і пасля параўналі іх паміж сабой.

Вынікі каменя на камні не пакінулі ад баскскай расавай тэорыі. Гены жыхароў іспанскіх правінцый і баскаў амаль аднолькавыя. Больш таго, самымі не іспанскімі жыхарамі Іспаніі, калі меркаваць па выніках эксперыменту, аказаліся не баскі, а жыхары правінцый Валенсія і Экстрэмадура. Баскі ў гэтым спаборніцтве на генную арыгінальнасць толькі трэція. І самае




**Гены жыхароў іспанскіх правінцый і баскаў амаль аднолькавыя. Больш таго, самымі не іспанскімі жыхарамі Іспаніі аказаліся не баскі, а насельнікі правінцый Валенсія і Экстрэмадура**

цікавае: генетычна баскі Францыі і Іспаніі не вельмі падобныя адзін на аднаго.

Такія вынікі прымушаюць перагледзець тэорыі паходжання баскаў. На думку ўсё тых жа вучоных, баскі і іспанцы жылі разам недзе на Блізкім Усходзе прыкладна 25 тысяч гадоў таму, адкуль разам і прышлі на Пірынейскі паўвостраў.

Новая версія гучыць дастаткова смела. Вучоныя хаця і крытычна ставіліся да ідэі ізаляцыі баскаў, усё ж аддалі перавагу тэорыі аб засяленні баскамі тэрыторыі Іспаніі раней за індаеўрапейскія народы. Старажытныя баскі здзейснілі вандраванне па Атлантычным узбярэжжы ў перыяды верхняга палеаліту і мезаліту. У дагістарычныя часы народы, родназныя баскам, былі шырока распаўсюджаны ў Заходняй Еўропе, засялялі тэрыторыі Іспаніі, Францыі і паўднёвай Бельгіі. Пазней, у працэсе кантактаў з рымлянамі, германцамі ўзніклі новыя народы. А вось у цяжка даступных горных раёнах Іспаніі працэс асіміляцыі быў не такім дынамічным. Менавіта таму тубыльцы здолелі захаваць страдаўнюю культуру і мову. Дарэчы, падобныя працэсы характэрныя для іншых горных народаў, напрыклад гуцулаў.

Хаця, з іншага боку, вучоныя з Барселоны самі прызнаюць, што іх даследаванняў занадта мала, каб сцвярджаць, што баскі і іспанцы блізкія родзічы. Для гэтага, кажа кіраўнік групы, трэба правесці аналізы генаў не ў сотні, а ў тысячы чалавек.

Застаецца дадаць, што крах баскскай расавай тэорыі палітычна хутчэй выгадны сучаснаму баскскаму нацыяналізму. Праціўнікі баскскіх сепаратыстаў ахвотна праводзілі паралелі паміж расізмам нацыстаў і расізмам баскаў. Неаднаразова расавыя забабоны баскскіх незалежнікаў і згадкі пра тэорыю Мурана былі падставамі для шумных антыбаскскіх кампаній у іспанскай прэсе.

Можна прагназаваць, што калапс баскскай расавай тэорыі азначае перамогу той фракцыі баскскага нацыянальнага руху, якая надае перавагу моўнаму, а не кроўнаму фактару. Для прыхільнікаў апошняй канцэпцыі баскам лічыцца не той, у жылах якога цячэ баскская кроў з адмоўным рэзус-фактарам, а той, хто размаўляе на баскскай мове.

## ЯНЫ ПРА НАС: ЗАМЕЖНАЯ ПРЭСА ПРА БЕЛАРУСЬ

У Беларусі будзе «адліга»: у байнэце зянятая забарона на доступ з Беларусі да сайтаў gay.ru, gaily.ru і qguys.ru, якія раней афіцыйна прызнаваліся заблакаванымі. Доступ на расійскі сервер стаў магчымы некалькі дзён таму і, у адрозненне ад мінулых «уключэнняў» рэсурсу, у дадзены момант усе часткі сайта даступныя для беларусаў. Як доўга будуць наведвальнікі з Беларусі мець доступ да рэсурсу, пакажа час.

**Internet.ru (Расія)**

Нягледзячы на змену прэзідэнта, Украіна наўрад істотна зменіць сваю пазіцыю ў адносінах з Расіяй. Першыя крокі Януковіча некаторыя аналітыкі параўноўваюць з паводзінамі прэзідэнта Беларусі Лукашэнкі. Але гэта не зусім так. Хаця Януковіч носіць беларускае прозвішча і мае беларускае паходжанне, а Лукашэнка — украінскае прозвішча (што нярэдка сустракаецца ў Беларусі) і па знешнім выглядзе ды хітрых паводзінах нагадвае хутчэй украінца, чым прастадушнага беларуса, паміж імі існуе вялікае адрозненне.

**«Контракты» (Украіна)**

Аляксандр Лукашэнка і яго паплечнікі ў чарговы раз і пакуль беспаспяхова спрабуюць знайсці альтэрнатыву расійскім энерганосьбітам то ў Іране, то ў Венесуэле. Беларускія НПЗ яны намерваюцца загрузіць венесуэльскай нафтай, у планах — удзел у распрацоўцы венесуэльскіх газавых радовішчаў. Але велізарныя адлегласці, падобна, стануць непераадольнай перашкодай на шляху рэалізацыі гэтых планаў. …Крызіс звузіў А. Лукашэнку прастору для манеўру — яму зноў давядзецца пазычаць або на Захадзе, або ў Расіі. У чарговы раз складаецца ўражанне, што А. Лукашэнка загнаў сябе самога ў тупік, з якога яму ўжо не выбрацца. Ён сапсаваў адносіны з Еўрасаюзам, сварыцца з Масквой, якая не спяшаецца выдаць яму новыя субсідыі. Верагодна, беларускаму лідэру гэтым разам цяжка будзе выйсці сухім з вады, і адзін са знешніх гульцоў атрымае перавагу ў той нязручнай сітуацыі, у якой апынуўся беларускі лідэр.

**«Евразийский дом» (Расія)**

Нечакана для ўсіх кіраўнік парламента Беларусі перадаў сябрам дэлегацыі Еўрасаюза ліст за подпісам спікераў парламентаў пяці дзяржаў, якія ўдзельнічаюць у праграме «Усходняе партнёрства» (Украіна, Грузія, Арменія, Азербайджан, Малдова). Спікеры заклікаюць лічыць Беларусь роўнай з іншымі дзяржавамі (гаворка ідзе пра ўдзел Беларусі ў парламенцкай асамблеі «Усходняга партнёрства» («Еўранэст»), куды ЕС не жадае запрашаць беларускіх дэпутатаў, пакольні не прызнае беларускі парламент. Салідарнасць з Мінскам збіраюцца выказаць і МЗС усіх дзяржаваў-удзельніц «Усходняга партнёрства». Цалкам верагодна, што такая падтрымка звязаная з непрызнаннем Мінскам Абхазіі і Паўднёвай Асецыі.

**REGNUM (Расія)**

Камітэт дзяржаўнай бяспекі Беларусі (КДБ) і Аператыўна-аналітычны цэнтр пры прэзідэнце (ААЦ) атрымалі поўны доступ да абаненцкіх базаў беларускіх аператараў сувязі. Пры гэтым пранікненне ў жыццё абанентаў будзе ажыццяўляцца за кошт сродкаў саміх аператараў. Для поўнага шчасця засталося толькі абавязаць кожнага беларуса за ўласныя грошы набыць і ўсталяваць у санвузле вебкамеры, уключаць ці выключаць якія будзе дазволена толькі супрацоўнікам КДБ ці ААЦ. Як у Оруэла.

**«Донецкий портал» (Украіна)**

## МІЖНАРОДНЫЯ НАВІНЫ

### ГЕРМАНІЯ. ХАЛОДНЫ ДУШ КАРЫСНЫ БЕДНЫМ

Ціла Саррацын, былы берлінскі сенатар ад партыі сацыял-дэмакратаў, працягвае шакаваць публіку сваімі заявамі. Раней ён нарабіў шмат гвалту, калі запісаў большую частку турэцкіх эмігрантаў у катэгорыю непатрэбных грамадству. Турэцкія сем'і ў ФРГ, на думку Саррацына, не што іншае, як «канвеер па штампоўцы дзяўчынак у ісламскіх хустках». Гэта цытата каштавала Ціла месца ў кіраўніцтве дзяржаўнай кампаніі «Bundesbank», якая не хацела сапсаваць адносіны з калегамі ў Турцыі. Аднак гэтага Саррацыну аказалася мала. Цяпер ён вырашыў выказацца наконт надзвычай ліберальнага праекта закона пра сацыяльную падтрымку Hartz–IV. Зараз нямецкае грамадства вельмі крытыкуе праект Hartz–IV за тое, што ён прадугледжвае скарачэнне дапамогі беспрацоўным. А вось Саррацын лічыць, што чым менш дапамогі, тым лепш. «Няма грошай на гарачую ваду? Трэба прыймаць халодны душ. Ён значна больш карысны для здароўя», — заявіў Ціла. Сентэнцыя ўжо выклікала пратэсты, асабліва з боку левых эсдэкаў, якія патрабуюць выключэнне скандаліста з шэрагаў партыі.

**Па матэрыялах «Suddeutschen Zeitung» (Германія)**




### ІСПАНІЯ. ЛІДЭРУ БАСКСКІХ НАЦЫЯНАЛІСТАЎ ДАЛІ ДВА ГАДЫ ТУРМЫ




Арнальда Атэгі, былы лідэр партыі прыхільнікаў незалежнасці краіны баскаў «Батасуна», блізкай да тэрарыстаў з групоўкі ЕТА, асуджаны на два гады турмы. Два гады за кратамі, як вырашыў іспанскі суд, будзе дастаткова для Атэгі, каб зразумець, што ўхваляць тэрарызм нельга. Менавіта па артыкулу «Ухваленне тэрарызму» і асудзілі Атэгі. Тэрарызм ён ухваліў, калі ў 2005 годзе выступіў з прамовай падчас пахавання былога сябра ЕТА, які памёр у іспанскай турме. Абараняючыся, Атэгі заявіў, што Канстытуцыя гарантуе кожнаму права на свабоду слова. Думаецца, што вырашальным момантам працэсу было нежаданне Атэгі адмовіцца ад гвалту як сродку палітычнай барацьбы. У турме ён знаходзіцца з кастрычніка мінулага года.

**Па матэрыялах «El Pais» (Іспанія)**

### ГРЭЦЫЯ. БАЙКОТ НЯМЕЦКІХ ПРАДУКТАЎ




Цікавыя наступствы мела публікацыя на вокладцы часопіса «Focus» старадаўняй элінскай статуі Венеры, якая паказвае непрыстойны жэст. Гэтым калажам выдаўцы «Focus» хацелі прадэманстраваць нежаданне грэкаў прымаць жорсткія патрабаванні еўрапейскіх органаў наконт бюджэтнай дысцыпліны. Менавіта такі рэжым, як сцвярджаюць эксперты ЕС, дапаможа грэкам выйсці з цяперашняга фінансавага крызісу. Грэкі адрэагавалі на калаж, нібы мусульмане на дацкія карыкатуры пра Мухамеда. Саюз дробных гандляроў заклікаў да байкоту тавараў з біркай Made in Germany. Байкатаваць нямецкія прадукты саюз прапаноўвае да таго часу, пакуль Берлін не папросіць прабачэння за Венеру. Пакпіўшы з Венеры, як гаворыцца ў пракламацыях ініцыятараў кампаніі, немцы «зняважылі элінскую гісторыю, харaство і цывілізацыю, якая паўстала ў часы, калі самі немцы елі бананы на дрэвах».

**Па матэрыялах «Suddeutschen Zeitung» (Германія)**

▸ **ВОДГУК АЛІМПІЯДЫ**

# ЗАКЛАДНІКІ СПОРТУ

**Правал расійскай алімпійскай зборнай у Ванкуверы стаў шокам для расійскага грамадства і кіраўніцтва краіны. Якія наступствы мела катастрофа і што збіраецца рабіць Расія далей, тым больш, што хутка алімпіяда ў Сочы? Пра гэта і іншае журналіст «Новага часу» Алег Новікаў размаўляе з супрацоўнікам расійскага Агенцтва палітычных навін (АПН) Аркадзем Шворцэрам.**



***— Наколькі тэма спорту важная для сучаснага расійскага грамадства, якая роля належыць гэтай тэме ў легітымізацыі ўлады?***

— Тэма спорту, колькасці алімпійскіх медалёў і спартовых рэкордаў расійскай каманды была адной з галоўных фішак рэжыму. Увогуле, некаторыя палітолагі кажуць, што новую дзяржаўную сімволіку — трохкаляровы сцяг — расійская супольнасць прыняла выключна дзякуючы перамогам спартсменаў, а канкрэтна — выхаду расійскай зборнай па футболу на чэмпіянат свету 2002 года. Вакол той падзеі была істэрыя.

Так ці інакш, правал расійскіх алімпійцаў у Канадзе аказаўся псіхалагічнай траўмай для ўсяго грамадства, якое прызвычаілася да лозунгаў, што хаця б у гэтай галіне «мы впереди планеты всей». На прыпынках, у курылках, на інтэрнэт-форумах шмат палемізуюць на тэму спорту. Важны момант: раней усю адказнасць за падобныя катастрофы перакладалі на суддзяў, якія быццам бы сімпатызуюць заходнікам. Цяпер тэма змовы супраць Расіі не такая папулярная. Людзі адмаўляюцца ад нацыяналістычных міфаў, прызнаюць, што рускія былі аб'ектыўна слабей за іншых.

***— Дрэнныя вынікі рускіх, 11-е месца ў агульным камандным заліку, здаюцца вельмі дзіўнымі на фоне вялізных інвестыцый у спорт. Калі верыць Крамлю, на падрыхтоўку расійскай каманды да Ванкуверу пайшло ў 5 разоў больш грошай, чым на падрыхтоўку да папярэдняй Алімпіяды ў Турыне. У чым прычына слабых вынікаў расійскіх алімпійцаў?***

— Правал расійскай зборнай — гэта правал так званай дактрыны «баблаверы», якая вельмі папулярная ў кіруючых колах. Крамлёўскія чыноўнікі напярэдадні Алімпіяды або іншых адказных спаборніцтваў кажуць спартсменам: паб'еш алімпійскі рэкорд — атрымаеш 100 мільёнаў. Нейкі час такая формула працавала, аднак не сёння. Каб стаць спартсменам, трэба сістэматычна займацца спортам яшчэ з дзяцінства. Аднак інфраструктура дзіцячага спорту ў Расіі вельмі слабая. Сваю ролю адыгрывае таксама дрэннае харчаванне, масавая мода сярод моладзі на спажыванне алкаголю. Іншымі словамі, мы пачынаем рыхтаваць алімпійцаў пазней, чым на Захадзе. Пры гэтым канкурэнцыя паміж спартоўцамі апрыёры больш слабая. Каб змяніць сітуацыю, трэба мяняць сацыяльную структуру. Тым больш у рэгіёнах, дзе ўсім руляць мясцовыя кланы.

***— Як крамлёўская адміністрацыя рэагавала на кепскія вынікі ў Канадзе?***

— Рэакцыя стала яшчэ адным доказам структурнага крызісу расійскай улады. Як толькі з Канады пачалі прыходзіць дрэнныя навіны, крамлёўскія босы сталі шукаць вінаватых. Натуральна, не ў недахопах сістэмы, а ў асобных персаналіях. Усю адказнасць звалілі на дырэктараў спартовых дэпартаментаў. Аднак на выхадзе адбыўся пшык — сваю пасаду захаваў чалавек, які нясе галоўную віну за Ванкувер. Размова пра міністра спорту Віталя Мутко. Карупцыя настолькі разлажыла эліту, што там не здольныя нават на радыкальныя кадравыя перастаноўкі. У выніку цяпер грамадству прапануюць забыцца на Ванкувер і ўсе сілы сканцэнтраваць на алімпіядзе ў Лондане і, натуральна, у Сочы.

Як толькі з Канады пачалі прыходзіць дрэнныя навіны, крамлёўскія босы сталі шукаць вінаватых. Натуральна, не ў недахопах сістэмы, а ў асобных персаналіях. Усю адказнасць звалілі на дырэктараў спартовых дэпартаментаў

***— Алімпіяда 2014 года ў Сочы займае вялікае месца ў дзяржаўнай прапагандзе. Гэта першыя гульні, якія прымае Расія. Якія вашы прагнозы наконт таго, ці будзе здольная краіна арганізаваць мерапрыемства такога ўзроўню?***

— Пакуль я скептык. Чым далей, тым відавочней, што ідэя сочынскай алімпіяды была вельмі валюнтарыстычнай. Пачнём з таго, што, па падліках спецыялістаў, каб адбудаваць да 2014 года інфраструктуру, патрэбна прыкладна 400 тысяч рабочых, галоўным чынам будаўнікоў. Прыкладна столькі людзей і жывуць у так званым Вялікім Сочы — кангламераце гарадоў на ўзбярэжжы Чорнага мора. Працаваць на будаўніцтве яны не збіраюцца. Іхні бізнес — сектар турыстычнага сервісу. Аднак мала хто ведае, куды пасяліць 400 тысяч будаўнікоў. Таксама не зразумела, як правесці туды дастатковы аб'ём энергіі. Трэба будаваць новыя лініі і фактычна ствараць лакальную энергасістэму. І гэта яшчэ не ўсё. Застаецца транспартнае пытанне. Паглядзіце на мапу Паўночнага Каўказу. Сочы звязвае з Расіяй адна лінія чыгункі, аўтатраса плюс аэрапорт. Пры ўсім жаданні яны не здольныя перавезці прыкладна 200 тысяч чалавек, якія, як чакаецца, прыедуць глядзець на спаборніцтвы.

***— Вядома, што Грузія — геапалітычны праціўнік Расіі ў рэгіёне, намагаецца нейкім чынам перашкодзіць гульням у Сочы, звяртае ўвагу на розныя экалагічныя аспекты алімпіяды і на парушэнне ў РФ правоў чалавека. Ці не варта чакаць, што Гульні ў Сочы стануць каталізатарам міжнароднай напругі?***

— Гэта цалкам рэальна. Акрамя таго, існуе не толькі грузінскае пытанне, аднак і праблема чэркесаў. Падчас каланізацыя рускімі Паўночнага Каўказа ў XIX стагоддзі шмат чэркесаў пагадзіліся эміграваць у Турцыю. Іх калонія вельмі ўплывовая ў гэтай краіне. Мяркуючы па ўсім, зараз чэркесы рыхтуюць да гульняў вялікую інфармацыйную кампанію, якая мае на мэце нагадаць усяму свету, што Сочы — гэта іх карэнная зямля, якую ў іх адабралі злыя каланізатары. Як бачым, праблемаў вакол Сочы хапае. І гэта ўсё з улікам таго, што ў Расіі дастаткова шмат раёнаў, больш гатовых да правядзення Алімпіяды. Той жа Ханты-Мансійск або Алтай. Дарэчы, з пункту гледжання развіцця, гэтыя рэгіёны маюць значная большую патрэбу інвестыцыях, чым і так нядрэнна развітая Кубань.

***— Якія палітычныя наступствы можа мець патэнцыйны правал алімпіяды ў Сочы?***

— Цяжка сказаць зараз. Да сочынскай алімпіяды яшчэ багата часу, і шмат што ў расійскай палітыцы відавочна зменіцца. Аднак, калі Пуцін застанецца ва ўладзе, сочынскі правал можа азначаць канец ягонай кар'еры. Вядома, што ВВП быў галоўным лабістам Сочы як кандыдата на Алімпіяду. Таму цалкам магчыма, што па ходу набліжэння алімпіяды вакол Пуціна ўзнікне нейкі палітычны і інфармацыйны вакуум. Праўда, перш трэба пачакаць вынікаў лонданскай алімпіяды для расійскай зборнай.

ПЕРШАЯ ЛЭДЗІ

# МЕГАЗОРКА З БЕЛАГА ДОМУ

Іван БІЧ



**У лютым споўніўся роўна год пражывання ў Белым доме сям'і Барака Абамы. Аднак калі рэйтынг прэзідэнта апошнім часам паступова зніжаецца, гэтага нельга сказаць пра гадавы баланс першай лэдзі.**

Мішэль Абама заўсёды ўмела добра апранацца. Журналісты жаночых часопісаў адзначалі яе густ яшчэ задоўга да таго, як яна стала гаспадыняй Белага дома. У 2006 годзе «Vanity Fair» паставіў яе ў спіс 10 best dressed women (дзесяці самых добра апранутых жанчын). У наступным годзе яна зноў была ў дзесятцы. Лічыцца, што якраз стыльная вопратка Мішэль падштурхнула шматлікіх мадэльераў перагледзець сваё стаўленне да мадэляў з чорнай скурай.

Ужо пасля абрання Барака на пасаду прэзідэнта нейкі журналіст заўважыў, што стыль Мішэль падабраны па прынцыпу «і нашым і вашым». Некаторыя элементы яе касцюмаў нагадваюць яркія фасоны Жаклін Кенэдзі — жонкі Джона Кенэдзі, куміра дэмакратаў. Аднак пры гэтым гарнітуры Мішэль вельмі класічныя. Менавіта класіцы аддавалі перавагу жонкі прэзідэнтаў ад рэспубліканскай партыі Барбара Буш і Нэнсі Рэйган. Такім чынам, Мішэль Абама — папуліст, робіць выснову журналіст.

Папулізм, жаданне спадабацца ўсяму грамадству характэрныя не толькі для эстэтычнага густу Мішэль. Праз год пасля таго, як яна стала першай лэдзі, амерыканская прэса амаль аднадушная ў адказе на пытанне, якую адзнаку заслужыла Мішэль на гэтай пасадзе. Як прагрэсіўныя, так і кансерватыўныя выданні і аналітыкі ставяць ёй вышэйшую адзнаку.

Правым рэспубліканцам, якія стаяць на абароне сям'і, імпануе, што Мішэль не пайшла шляхам Хілары Клінтан, якую падчас першай прэзідэнцкай кадэнцыі Біла Клінтана неафіцыйна называлі віцэ-прэзідэнтам. Аднак спроба гуляць з мужам на роўных ролях у выніку не спадабаліся амерыканцам. Хутка пад ціскам публічнай думкі Хілары была вымушана не так актыўна каментаваць курс адміністрацыі і прапаноўваць законапраекты.

Мішэль, наадварот, амаль дэманстратыўна адмаўляецца браць удзел у дэбатах, звязаных з вялікай палітыкай, што менавіта і патрабуе ад жанчыны кансерватыўны сямейны кодэкс.

Аднак дэмакраты, якія традыцыйна носяцца з фішкамі фемінізму, таксама не хаваюць пазітыўнага стаўлення да Мішэль. Тая не падобная на Лауру Буш — папярэднюю першую лэдзі, якая ўсю энергію скіравала на хатнія бытавая справы і была рэдкім госцем на фуршэтах і прыёмах. Мішэль, не ў прыклад Лауры, — сталы герой палітычнай і культурнай хронікі.

«Хацела б зрабіць штосьці, каб пра мяне маглі сказаць: яна нешта сапраўды змяніла», — так сфармулявала Мішэль сваё крэда перад журналістамі яшчэ год таму падчас адной з першых прэсканферэнцый пасля абрання Барака Абамы прэзідэнтам.

У цэнтры яе актыўнасці аказаўся план барацьбы з атлусценнем сярод дзяцей. Пра гэту праблему пачалі казаць прыблізна год 30–40 таму, аднак да дзяржаўнай праграмы ўсё рукі не даходзілі. Між тым, сёння кожнае трэцяе амерыканскае дзіця мае залішнюю вагу.

**Праз год існавання адміністрацыі Абамы, можна казаць, што сваё месца ў народнай палітычнай культуры Мішэль знайшла. Яна стала падобнай да поп-зоркі, візіты якой за мяжу цікавыя для ўсіх жаночых часопісаў і грамадскіх СМІ.**

Кампанія Мішэль Абамы называецца «mom-in-chief» (маці — галоўны кухар). Мэта кампаніі — падштурхнуць бацькоў самім гатаваць для дзяцей якасную ежу, а не прапаноўваць замоўленую ў рэстаранах. «Mom-in-chief» — гэта не толькі прапаганда здаровай гастраноміі. Бацькоў заклікаюць менш сядзець каля тэлевізараў, больш праводзіць з дзяцьмі часу на свежым паветры, на спартовых пляцоўках.

Дарэчы, праблема дзіцячай тлустасці не абышла і прэзідэнцкую сям'ю. Тая ж Мішэль Абама ў інтэрв'ю распавяла, наколькі стомленай яна раней прыходзіла дахаты пасля працы. Не маючы сілаў зрабіць дзецям нармальную ежу, папросту замаўляла нешта з бліжэйшага рэстарану хуткага харчавання. Праз некалькі гадоў убачыла, што ў яе абедзвюх дачок, Сашы і Маліі, праблемы з залішняй вагой.

Эксперты падкрэсліваюць, што Мішэль зрабіла абсалютны правільны выбар. Праблема атлусцення і дзяцей і бацькоў відавочна важная для выбаршчыкаў як правых, так і ліберальных поглядаў. У гэтым кантэксце таксама часта згадваюць пракол Хілары Клінтан, якая, калі перабралася ў Белы дом, вырашыла заняцца рэформай сістэмы аховы здароўя, наконт якой у грамадстве існуе шмат супярэчлівых канцэпцый.

Акрамя таго, кампанія Мішэль Абамы сама па сабе працуе на павышэнне папулярнасці дэмакратаў. Як сведчыць статыстыка, галоўныя ахвяры эпідэміі дзіцячай тлустасці — дзеці з бедных сямей чарнаскурых або лацінаамерыканцаў. Лацінаамерыканцы, асабліва жанчыны, у большасці — каталікі, вельмі асцярожна ставіцца да прагрэсіўных лозунгаў дэмакратаў наконт планавання сям'і і легалізацыі абортаў. Цяпер ёсць шанец, што дзякуючы Мішэль яны зменяць свае погляды адносна дэмакратаў.

Праз год існавання адміністрацыі Абамы, можна казаць, што сваё месца ў народнай палітычнай культуры Мішэль знайшла. Яна стала падобнай да поп-зоркі, візіты якой за мяжу цікавыя для ўсіх жаночых часопісаў і грамадскіх СМІ. І як вынік — на фоне паступовага падзення рэйтынгу прэзідэнта, узровень даверу да яго жонкі расце. Можна прагназаваць, што ў выбарчай кампаніі Барака Абамы 2012 года Мішэль будзе адыгрываць значна большую ролю, чым два гады таму.

Адзіныя, каму дакладна не падабацца папулізм і зоркавы імідж мадам Абамы — радыкальныя феміністкі. На іх думку, замест таго, каб красавацца на вокладках жаночых часопісаў, Мішэль мусіла б змагацца з самой індустрыяй гэтых часопісаў як важнага чынніка кансервацыі сістэмы мужчынскага дамінавання ў грамадстве.

## ПАЛІТЫКІ ТЫДНЯ

### ВАЛЕРЫЙ БЕЛАШЭЙКІН



Мэра горада Асбеста, што ў Свярдлоўскай вобласці, лідэра мясцовай секцыі партыі «Адзіная Расія» Белашэйкіна могуць зняць з выбараў галавы горада за выкарыстанне мультыплікацыйнага персанажу ў сваёй палітычнай рэкламе. У прынцыпе, Белашэйкін сам вінаваты. Раней нехта з ягонай каманды звярнуў увагу на тое, што ў агітацыйных матэрыялах галоўнага кандыдата ад апазіцыі Таццяны Саф'інай прысутнічае папулярны персанаж Нязнайка з аднайменнага мультфільма. Ніякага права стваральнікі Нязнайкі Таццяне на выкарыстанне вобразу ў агітацыі, натуральна, не давалі. Белашэйкін хуценька падаў у суд, і апазіцыянерку знялі з выбараў. Аднак праз нейкі час ужо апазіцыянеры звярнулі ўвагу на тое, што па гораду раздаюцца коміксы, у якіх Белашэйкін дзеліцца сваімі планамі з героямі мультфільмаў Дыснея. Тыя ў захапленні ад ідэй мэра і дружна скандуюць: «Тут будзе горад-сад!» Зараз суд павінен вырашыць, ці мае Белашэйкін права выкарыстоўваць Скруджа, Мікі Маўса і Дональда.

### ХОСНІ МУБАРАК



Прэзідэнта Егіпта, якому ўжо 81 год, напрыканцы гэтага тыдня чакае складаная хірургічная аперацыя ў Германіі. Па канстытуцыі, у падобных выпадках прэзідэнт мае права перадаць на час лячэння ў шпіталі свае паўнамоцтвы віцэ-прэзідэнту. Мубарак так і зрабіў. Здавалася б, фармальная працэдура, аднак яна выклікала вялікія дэбаты ў краіне. Нават некаторыя дзяржаўныя СМІ, каментуючы стан здароўя прэзідэнта, заклікаюць пачаць рыхтавацца да таго, што, магчыма, краіне хутка давядзецца жыць без Мубарака, які не пакідае пасаду прэзідэнта ўжо 29 год. Пачалі нават хадзіць чуткі, што сын Мубарака і лідэр дзяржаўнай Нацыянальнай дэмакратычнай партыі паспелі перасварыцца з-за таго, хто будзе пераемнікам пацыента нямецкай клінікі. Актывізаваліся апазіцыянеры з руху «Браты-мусульмане». Самае цікавае, што перад тым, як пайсці ў шпіталь, Мубарак пажартаваў наконт таго, што ў краіне магчыма стварэнне апазіцыйнага ўраду, і нават заклікаў суайчыннікаў лаяльна ставіцца да яго існавання, як таго патрабуе канстытуцыя.

### ДЭВІД КАМЕРОН



Кіраўнік партыі брытанскіх кансерватараў у чаканні чэрвеньскіх выбараў у парламент, па выніках якіх торы маюць цудоўны шанец сфармаваць кабінет. Аднак лейбарысты — цяперашнія гаспадары Даўнінг-стрыт, 10, так проста здавацца не збіраюцца. Яны раздулі буйны скандал вакол лорда Ашкрофта, аднаго з галоўных спонсараў кансерватараў. Ашкрофт ужо пагадзіўся выдаць партыі Камерона два мільёна еўра на выбарчую кампанію. Праблема, аднак, у тым, што, як стала вядома, арыстакрат ніколі не плаціў падаткі ў Вялікабрытаніі. Між тым, самі торы раней казалі, што Ашкрофт плаціць падаткі ў брытанскую казну. Гэта адразу выклікала палітычны шторм. Лейбарысты кажуць, што лорд купіў партыю торы і нават збіраецца заняць адну з пасад у кабміне Яе Вялікасці пасля будучых выбараў. У адказ Камерон паабяцаў не ўключаць лорда ў свой будучы ўрад і нагадаў лейбарыстам, што некаторыя спонсары таксама не рэзідэнты ў Брытаніі. Так ці інакш, скандал надаў выбарам інтрыгу. Калі верыць выданню «Mail on Sunday», адрыў кансерватараў ад лейбарыстаў скараціўся да двух працэнтаў (38 працэнтаў брытанцаў гатовыя галасаваць за партыю Камерона, а 36 працэнтаў — за лейбарыстаў).

▸ КАНТАКТЫ

# HALMA MATER

## «МЫ ДЛЯ ІХ — АПОШНІ ФАРПОСТ ЕЎРОПЫ»

**«І як вам трактары «Беларус»?» — публіка з апошніх сілаў прыдумвала пытанні для пісьменніка Трыстана Х'юза. — «Супер. Яны героі гэтага тыдня: прыбраць столькі снегу! — адказваў Трыстан. — А ўвогуле, я вырас у Канадзе, а бацька мой — фермер, так што ані маразамі, ані агратэхнікай мяне не здзівіш».**

**Дзіўным у гэтай размове выпадковаму наведніку галерэі «Ў» магло падацца ўжо тое, адкуль у Мінску ў разгар суровай зімы наогул мог узяцца літаратар з Уэльсу. Гэта нечаканае з'яўленне адбылося дзякуючы еўрапейскай сетцы літаратурнага абмену Halma. Пра спецыфіку дзейнасці гэтай арганізацыі ў Беларусі Алесь Гінзбург гутарыць з Вольгай Гапеевай — дырэктаркай беларускай філіі Halma.**


Дом перакладчыка ў Ty Newydd (Уэльс) — партнёр сеткі Halma


Мінск прадстаўлены ў сетцы Halma як «Горад Сонца»

### «Ніякага кантролю няма»


Вольга Гапеева

***— З якога часу і якім чынам адбываецца «творчы абмен» паміж краінамі Еўрасаюза і Беларуссю?***

— Са снежня 2008 года, калі на чарговай сесіі Halma выдавецтва «Логвінаў» прынялі ў арганізацыю, мы маем магчымасць прымаць пісьменнікаў на творчыя стыпендыі. Па-добраму, у нас павінен быць нейкі ўласны «домік творчасці», як амаль ва ўсіх сябраў аб'яднання, але пакуль не дазваляюць фінансавыя магчымасці — таму ў Мінску пісьменнікі жывуць на здымнай кватэры ў цэнтры. Прыязджаюць на месяц. Праграма дае магчымасць выбраць дзве краіны запар, і пісьменнікі гэтым ахвотна карыстаюцца. Заяўкі разглядаем не мы. Калі нехта абірае Беларусь, з намі звязваюцца каардынатары: «Ці можаце вы прыняць пісьменніка ў такі і такі час?» — «Канешне, можам!» Творца атрымлівае грошы на дарогу і жыццё ў сваіх фундатараў і прыязджае ў Мінск.

***— І сядзіць і піша?***

— Ну, гэта яго справа, чым ён тут будзе займацца, — ніякага кантролю няма: можна адпачываць, пісаць, займацца навуковымі доследамі… Многія пісьменнікі — людзі ў веку пасля трыццаці, таму іх звычайны план — «дапісаць раман» або «скончыць дысертацыю». Адзіны абавязак аўтара — літаратурная імпрэза ў краіне, якая прымае, чытанне дзвюма мовамі, адпаведна, мусіць быць зроблены пераклад вершаў ці прозы.

***— Ці ездзяць беларускія пісьменнікі ў творчыя дамы Halma?***

— Пакуль гэта даволі складана. У Halma ёсць фінансавы падзел паміж краінамі: адны дзяржавы самі ў стане аплачваць аўтарам вандроўку і выдаваць стыпендыі, а іншыя — не. Беларусь, як і прыбалтыйскія, скажам, краіны, — не ў стане. Сама Halma не выдае грошай — яна прапаноўвае цікавыя магчымасці кудысьці паехаць. Так што пры нашай дапамозе ў Еўропе могуць даведацца: так, мы існуем, і ў нас таксама ёсць цудоўная літаратура, — але стыпендыі беларусы павінны шукаць самі. Да таго ж, мы не можам удзельнічаць у большасці праграм Halma, паколькі Беларусь не ўваходзіць у Еўрасаюз.

***— Якія патрабаванні высоўвае Halma да стыпендыятаў?***

— Аддаюць перавагу тым, хто ўжо праявіў сябе ў літаратуры і мае пэўны патэнцыял: пісьменнік павінен мець прынамсі адну кнігу. Нікога не турбуе, якое выдавецтва прадстаўляе аўтар і ці ўваходзіць ён у нейкія творчыя саюзы. У некаторых выпадках аўтару неабходныя рэкамендацыі ад аўтарытэтных дзеячаў культуры на радзіме ці за мяжой. Творчасць апліканта, калі яна не па-нямецку ці па-англійску, павінна мець пераклад на адну з гэтых моваў, каб журы магло ацаніць яго ўзровень. І гэта яшчэ адна праблема сучасных беларускіх літаратараў на шляху да еўрапейскіх стыпендый: нас няма каму перакладаць. Мы, зразумела, можам перакласці сябе самі, чым і займаемся, але гэта моветон у перакладчыцкай традыцыі. Важна вырасціць пакаленне перакладчыкаў з беларускай на замежныя мовы, для якіх гэтыя мовы — родныя… У Еўропе неверагодная колькасць фінансавых праграм для літаратараў, стыпендыяты якіх могуць паехаць у творчыя дамы Halma. Прафесійны пісьменнік з пашпартам Еўрасаюза можа ўсё жыццё толькі і рабіць, што мяняць дамы творчасці.

### Рональд, Анна, Трыстан

***— Якія заходнія аўтары да нас ужо прыязджалі? Чаму яны абралі менавіта Беларусь і ці спраўдзіліся іх чаканні ад паездкі?***

— На дадзены момант у нас было тры «візіцёры». Швейцарац Рональд Райхен прыязджаў у жніўні 2009 года. Гэта быў наш першы госць, і мы вельмі перажывалі, як усё пройдзе. Яго паездка была ўдалай: было лета, сонца, Рональд шмат з кім тут пазнаёміўся. Пасля ад'езду я спыталася пра яго ўражанні, ці не трэба нам нешта змяніць, палепшыць. Рональд адказаў захопленым лістом: «У мяне залатыя згадкі пра Беларусь!» Канешне ж, было прыемна пачуць такія словы. Прычына, па якой ён прыехаў, — Райхен ніколі не быў у гэтай частцы Еўропы. Творчая стыпендыя — выдатная нагода зрабіць такі вояж, на які ён ніколі не адважыўся б самастойна, а Мінск — самая ўсходняя кропка сеткі Halma. Я так зразумела, мы для іх — апошні фарпост Еўропы перад ледзь не Сібір'ю.

Другая госця — Анна Кім, аўстрыйская пісьменніца карэйскага паходжання, піша па-нямецку. Ёй не надта пашанцавала з часам, бо была тут самай дэпрэсіўнай парой, у лістападзе-снежні 2009 года. Яе паездка была звязаная з творчасцю: першы раман Анны быў прысвечаны вайне ў Косава, другі яна будзе пісаць пра Ісландыю. Здаецца, яна паспрабавала праверыць, наколькі суровую зіму ў стане вытрымаць. Ну і, канешне, Беларусь цікавіла Анну як краіна з няпростым палітычным фонам.

Трэці пісьменнік — Трыстан Х'юз — валійска-канадскага паходжання, які гасціў у студзені 2010-га. Ён дапісваў тут свой чацвёрты раман. Яго чытанні ў межах «Літаратурнай кавярні», дарэчы, сабралі найбольш народу: магчыма, паўплывала большая пашыранасць у нас англійскай мовы. З Беларусі Трыстан паляцеў на выспу Радос на другую частку стыпендыі.

### Навошта паэту грошы

***— Сацыёлаг Алена Гапава, уражаная агучаным у прэсе невысокім памерам пенсіі народнага пісьменніка Рыгора Барадуліна, спыталася ў сваім блогу: «Якая пенсія мусіць быць у паэта?» І адзін малады хлопец, які піша вершы, ёй адказаў так: «Я думаю, гэта, па-першае, прыніжэнне, а па-другое, подласць — брацца ў грамадства грошы за тое, што ты паэт (…) Паэзія — твой асабісты выбар, і наўрад ці камусьці сапраўды патрэбны паэт, а вось сантэхнікі, пекары, прадаўцы патрэбныя. Ім і пенсія». Магчыма, паводле свайго службовага становішча ў Halma, ты кампетэнтная адказаць: навошта ўкладаць грошы ў людзей, якія пішуць?***

— Гэта розніца ў менталітэтах (хоць я вельмі не люблю гэтага слова). Да таго ж, кніжны рынак у нашай краіне функцыянуе зусім іначай, чым на Захадзе. У нас і за мяжой сапраўды рознае стаўленне да таго, кім ёсць пісьменнік. Вельмі нямногія творцы на ўсім свеце здольныя жыць са сваёй творчасці. У нас, калі ты працуеш выкладчыкам, журналістам, грамадства бачыць гэта і задаволенае: працуй, паэт, ты ж здольны сам сябе пракарміць! А літаратура лічыцца хобі, якім ты займаешся ў вольны час.

Інакш у Еўропе. Той жа Трыстан Х'юз мае вучоную ступень у літаратуразнаўстве, але ўжо доўгія гады не працуе выкладчыкам: гэта адцягвае яго ад творчасці, кажа ён. Яшчэ, відаць, прычына ў тым, што ў Еўропе ёсць рэзерв грошай, які можа быць выдаткаваны на ўтрыманне літаратуры. Да пісьменнікаў ставяцца як да аўтарытэтаў у публічных пытаннях, да іх прыслухоўваюцца. Ёсць разуменне: прагрэс літаратуры — гэта прагрэс грамадства ў цэлым. У нашых жа чыноўнікаў такога разумення няма.

***— Якім беларускія партнёры Halma бачаць свой будучы дом творчасці? Мне, прынамсі, з таго, што мы можам прапанаваць Еўропе экзатычнага, уяўляецца такі сабе «хутар на балоце»…***

— Я разумею чаканне экзатычнага, якое маюць, едучы сюды, замежнікі. Але пісьменнікі розныя па натуры: адным лепш працаваць у бязлюднай вёсцы, другім — у шумным горадзе. Будуючы свой дом, усім не дагодзіш. Збудаваць такі дом у Мінску па фінансавых прычынах нерэальна. Таму аптымальны варыянт — дом непадалёк ад Мінска. Напрыклад, у Ракаве ці Заслаўі. Магчыма пацягнуць набыццё будынка ці сялібы ў 200 кіламетрах ад сталіцы, але гэта малаверагодна. Бо любы вясковы ідылічны дамок патрабуе давядзення да ладу: прыбіральня, душ, інтэрнэт, пісьмовы стол, ложак. Нават аскетычны варыянт вымагае гэтага джэнтльменскага набору. Паўстае вельмі шмат выключна побытавых, нятворчых пытанняў.

***— Але я маю на ўвазе хутчэй гісторыка-культурнае значэнне такога «дамка творчасці». Соус, пад якім падаецца Мінск у каталозе Halma, — гэта «Горад Сонца» Артура Клінава. Якую яшчэ гісторыю, легенду ў ідэале можна было б прапанаваць пісьменнікам пра Беларусь або нейкі яе куточак?***

— Гэта не наша мэта — прыдумляць легенды і шукаць нейкі цымус. Ты кажаш пра «хутар на балоце» — у эстонскіх партнёраў Halma прыкладна так і ёсць. Палескімі камарамі нікога не здзівіш. Няма сэнсу даваць нейкую адмысловую рэкламу, усё адно чалавек з-за мяжы вырашае ехаць у Беларусь па нейкіх сваіх, мала зразумелых нам прычынах. У якім менавіта асяроддзі яны будуць тут жыць — рэч для замежнікаў малаважная. Калі людзям наогул цікавая краіна, ім тут усё будзе цікава.

Паводле http://www.halma-network.eu

### Даведка:



Halma network — сетка літаратурных дамоў, якая на дадзены момант уключае ў сябе 26 інстытуцый. Само слова «хальма» абазначае гульню накшталт шашак. У нас вядомы яе варыянт пад назвай «вугалкі». Гульня была вынайдзена ў 1884 годзе ў ЗША, яе сэнс — у перамяшчэнні фішак на квадратнай дошцы са свайго кута ў кут суперніка. Прыкладна гэткім жа чынам працуе сетка Halma, мэта якой — «перамяшчэнне літаратуры», пісьменніцкі абмен у Еўропе дзеля таго, каб розныя творцы «адчулі на сабе разнастайнасць культураў». Пісьменнік, які прымаецца да ўдзелу ў праграмах абмену, можа выбраць два дамы творчасці па ўсёй Еўропе, у кожным з якіх мае права жыць і працаваць месяц. Halma пачыналася з саюзу ўсяго некалькіх творчых дамоў у Польшчы, Германіі, Аўстрыі. І толькі нядаўна атрымала сапраўды шырокую геаграфію. Беларускае выдавецтва «Логвінаў», якое падтрымлівае стыпендыяльныя праграмы ў Беларусі, — партнёр Halma са снежня 2008 года.

СПАДЧЫНА

# ДАЧКА ВІТАЎТА

Кастусь ТАРАСАЎ

**Князь Вітаўт пражыў 80 гадоў і быў тройчы жанаты. Ад другой жонкі, Ганны Смаленскай, у яго нарадзілася дачка Соф'я. Вітаўт увайшоў у гісторыю як вялікі князь літоўскі, а Соф'я — як вялікая княгіня маскоўская. Уплыў абодвух на ход гістарычных падзей са значнымі наступствамі — бясспрэчны.**


Князь Васіль і княгіня Вольга

## Княжацкая школа

Соф'я нарадзілася ў 1371 годзе. Яе дзяцінства было шчаслівым. У Літве вярхоўную княжацкую ўладу дзялілі браты — Альгерд і яе дзед Кейстут. Соф'я жыла то Старых Троках, то ў гарадзенскім замку. Аднак усё змянілася са смерцю князя Альгерда. Барацьба Ягайлы за ўладу распачала трагічную старонку ў жыцці Вялікага княства. У дзесяць гадоў ёй давялося перажыць страты — смерць дзеда ў Крэўскім замку, дзе ён быў задушаны па загадзе Ягайлы, і смерць бабкі Біруты, якую чаляднікі Ягайлы ўтапілі ў Мухаўцы.

Яе бацька, князь Вітаўт, апынуўся ў той жа замкавай каморы, дзе быў забіты Кейстут. Соф'я з маці прыязджалі да яго ў Крэва. Калі бацька здолеў збегчы, ім давялося шукаць прытулак пад крылом крыжакоў. Вітаўт вымушаны быў прыняць «нямецкую веру», каб вадзіць атрады рыцараў на землі Ягайлы.

Першыя ўрокі крывавага майстэрства барацьбы за ўладу Соф'я атрымала з таемных гутарак бацькі з маці — моцнае выпрабаванне для псіхікі дванаццацігадовай дзяўчынкі. Яна яго вытрымала, урокі засвоіла.

У 1384 годзе Ягайла перад Крэўскай уніяй Вялікага княства Літоўскага з Польшчай таемна прапанаваў Вітаўту замірыцца і вярнуў яму Гарадзенскі, Брэсцкі і Луцкі ўдзелы. У Луцку выпадак звёў Соф'ю з князям Васілём, сынам Дзмітрыя Данскога. Два гады ардынцы ўтрымлівалі Васіля закладнікам за бацькаўскі доўг у 8 000 рублёў срэбрам. З дапамогай баяраў князь уцёк на Валынь, дзе намеснічаў Вітаўт і дзе жыла яго 15-гадовая дачка. Сустрэча Васіля і Соф'і завяршылася заручынамі.

Заняўшы польскі трон у Кракаве, Ягайла палічыў залішнім выконваць свае абяцанні Вітаўту. Вітаўт зноў сышоў да крыжакоў і разам з нямецкімі рыцарамі арганізаваў шэраг паходаў на Літву. У перыяды такіх паходаў Соф'я з маці знаходзілася ў сталіцы Ордэна — Мальбарку.

Так яна атрымала яшчэ адзін урок: у сваіх бітвах за ўладу родзічы літасці не ведаюць, чужацкага ворага шануюць вышэй, таму што за яго можна атрымаць выкуп, а з памілаваных сваякоў вырастаюць мсціўцы.

## Сваякі

У 1386 годзе смаленскі князь Святаслаў разам з сынамі Глебам і Юрыем, сабраўшы войска, рушылі паходам на Мсціслаў. Сталі пад горадам дзесяць дзён, але ўзяць не змаглі. На адзінаццаты дзень на падмогу гораду падышлі Вітаўт і Скіргайла з палкамі. Смаляне сышліся з імі ў бітве на рацэ Вехры. Князь Святаслаў загінуў. Вітаўт і Скіргайла падышлі да Смаленска, узялі з яго выкуп і пасадзілі на княжанне Юрыя. У 1395 годзе Вітаўт загадаў смаленскім князям выехаць да яго за ахоўнай граматай, аднак па дарозе іх схапілі і адправілі ў Ліду. Затым Вітаўт авалодаў Смаленскам і пасадзіў там сваіх намеснікаў.

У 1401 годзе дзядзька Соф'і, князь Юрый, разам з цесцем, князем Алегам Разанскім, адваяваў Смаленск, забіў намесніка Вітаўта і адданых яму баяр. Але ўвосень Вітаўт з палкамі вярнуў Смаленск пад сваю ўладу. Князь Юрый мусіў уцякаць у Наўгародскае княства, дзе яго пагадзіліся прытуліць. Жыў ён у Таржку, дзе знайшоў прыстанак выгнаны разам з ім князь Сямён Вяземскі. Князь Юрый закахаўся ў жонку Сямёна Вяземскага Ульяну, забіў яе мужа і спрабаваў сілай авалодаць удавой. Але княгіня, баронячыся, схапіла нож ды кінулася бегчы. Разлютаваны князь Юрый дагнаў яе на двары і пасек мячом. Усвядоміўшы, што нарабіў, Юрый збег у Разанскую зямлю, дзе жыў і замольваў грахі ў пустэльніка. Там і памёр у 1409 годзе.

Улада, каханне, гвалт, кроў і здрады — яшчэ адзін урок сямейных адносін для Соф'і, якой бацькоўскай воляй наканавана было стаць жонкай князя Васіля.

## Яе сям'я

Княжанне Васіль прыняў у 1389 годзе пасля смерці бацькі, Дзмітрыя Данскога, згодна яго волі. За нявестай Соф'яй у ордэнскую сталіцу ад вялікага князя маскоўскага было скіравана адмысловае пасольства. З Мальбарка Соф'я морам паплыла ў Пскоў, з яго дабралася ў Ноўгарад, дзе яе сустракалі ад асобы жаніха яго дзядзька Уладзімір Серпухаўскі і яго малодшы брат князь Андрэй. 1 снежня 1390 года санкавы абоз даставіў князёўну ў Маскву.

Так Соф'я, дачка Вітаўта, стала Соф'яй Вітаўтаўнай, вялікай княгіняй маскоўскай. Там ёй спатрэбіліся ўсе ўрокі барацьбы за ўладу, атрыманыя ў бацькоўскіх уладаннях.

У Дзмітрыя Данскога і жонкі яго Еўдакіі было 12 дзяцей. Двое памерлі да прыезду Соф'і, але заставалася яшчэ дзесяць, прычым малодшы сын Канстанцін з'явіўся на свет за чатыры дні да смерці бацькі.

У самой Соф'і з Васілём нарадзілася пяць сыноў і чатыры дачкі. Першай з'явілася на свет у 1393 годзе Ганна, якую аддалі ў 14-гадовым узросце за візантыйскага цэсарэвіча Іаана Палеалога. Дачка Анастасія выйшла замуж за Аляксандра Алельку, што валодаў Слуцкім княствам. Васіліса і Марыя былі аддадзеныя за рускіх князёў.

Але на сынах Васіля і Соф'і стаяла пячатка року: Юрый памёр на сёмым годзе жыцця, Іван — на дваццатым, Сімеон і Даніла не пражылі і года. І толькі Васіль, якога Соф'я нарадзіла ў 44 гады, аказаўся доўгачаканым спадчыннікам.

Смерць першага і другога сыноў стварылі сітуацыю, калі барацьбу за маскоўскае княжанне пачалі іншыя нашчадкі князя Дзмітрыя, трымаючыся звычаю, які дазваляў узыходзіць на пасад і малодшым братам.

Магчыма, Соф'ю з мужам выцеснілі б з Крамля на задворкі, калі б бацькам Соф'і не быў князь Вітаўт, які ў 1392 годзе прыйшоў да ўлады ў Вялікім княстве Літоўскім і ўтрымліваў яе аж да 1430-га, да самай смерці.

Двойчы, у 1399 і ў 1408 гадах, Вітаўт і Соф'я — бацька і дачка, вялікі князь і вялікая княгіня — сустракаліся ў Смаленску. Яшчэ раз яны пабачыліся праз дванаццаць гадоў, калі бацьку было ўжо за 72, а Соф'і — за 50. Разумеючы сілу свайго цесця, князь Васіль перад смерцю ў 1425 годзе «даручыў» жонку і дзесяцігадовага спадчынніка, таксама Васіля, апецы князя Вітаўта.

## Міжусобіца

Васіль, пачаўшы княжыць па смерці бацькі ў 1425 годзе, сам па маленстве кіраваць не мог. Рэальнай вялікай княгіняй маскоўскай была Соф'я Вітаўтаўна. Не ўсе пагаджаліся з такім станам рэчаў: брат нябожчыка, Юрый, адмовіўся прысягнуць пляменніку Васілю і скіраваўся ў свой горад Галіч збіраць войска для вайны за маскоўскі пасад. Туды ж, у Галіч, але з мэтай уникнуць вайны, па дамоўленасці з княгіняй Соф'яй, выправіўся мітрапаліт Фоцій. Юрый, усвядоміўшы, што яго апалчэнне не зможа перамагчы маскоўскую конніцу, прызнаў сябе малодшым братам 10-гадовага пляменніка.

Але смерць Вітаўта ў 1430 годзе спрыяла абуджэнню ваяўнічых планаў у сямействе князя Юрыя. Ён гвалтоўна пазбавіў пляменніка вялікага княжання і «велікадушна» даў у долю Каломну.

Давялося Соф'і выехаць з Масквы. Змірыцца са становішчам удзельнай княгіні яна не магла, таму арганізавала праз царкву абурэнне самаўпраўнасцю малодшага сына Данскога. Юры, нядоўга пасядзеўшы вялікім князем маскоўскім, палічыў за лепшае вярнуцца ў свой Звянігарад. Там ён раптам сканаў, што выклікала падазрэнне ў атручванні. Вайна працягвалася да 1436 года, калі князь Васіль Касы, пляменнік Юрыя, накіраваўся ў Кастраму збіраць войскі супраць вялікага князя Васіля. У бітве Касы быў захоплены ў палон, адвезены ў Маскву і па рашэнні баяраў асляплены.

У 1440 годзе ў Троцкім замку князь Аляксандр Чартарыйскі па баярскай змове забіў роднага дзядзьку Соф'і — вялікага князя літоўскага Жыгімонта Кейстутавіча. На вызваленае месца паны і шляхта паклікалі вялікім князем 14-гадовага Казіміра, малодшага сына Ягайлы. Гэты стрыечны брат падыходзіў ёй ва ўнукі, ён з'явіўся на свет, калі Соф'і было 55 гадоў.

## За помсту помста

Князь Васіль выступіў супраць татараў, якія ў 1445 годзе занялі Ніжні Ноўгарад, але ў бітве трапіў у палон — у непрытомнасці пасля шабельнага ўдару. Потым на яго галаве налічылі трыццаць ран. Татары адправілі ў Маскву княгіні Соф'і нацельны крыж сына, каб яна не ўсумнілася ў яго бядзе. Соф'я Вітаўтаўна выкупіла Васіля за вялізную па тых часах суму ў 25 000 рублёў. Збор такіх сродкаў выклікаў сярод маскоўскага баярства смуту.

Князь Дзмітрый Шамяка гэтым скарыстаўся. Падчас ад'езду князя Васіля на багамолле Шамяка са сваімі прыхільнікамі захапіў Маскву і паланіў жонку князя і княгіню-маці Соф'ю, а затым у Траецкім манастыры паланіў вялікага князя Васіля. Васіль быў адвезены ў Маскву ў двор Шамякі, дзе 20 лютага 1446 года яго асляпілі і з жонкай саслалі ў Угліч. Было яму трыццаць гадоў, а наступных шаснаццаць ён пражыў у слепаце, і таму сталі яго зваць Васіль Цёмны. Княгіня Соф'я была саслана ў Чухламу.

У гэтай трагедыі яна выявіла цвёрдасць характару і энергію да дзеяння, здолеўшы арганізаваць сваіх прыхільнікаў. Іх дружыны сталі сцягвацца да Угліча. Князь Васіль прыбыў у Цвер. У 1450 годзе Шамяка быў пабіты пад Галічам, збег у Ноўгарад і памёр, паеўшы курыцы, якую атруціў яго асабісты кухар.

У 1451 годзе на Маскву рушылі татары. Васіль Цёмны адправіўся збіраць войска для адпору ворагу, а ў Маскве засталася кіраваць Соф'я Вітаўтаўна. Хронікі адзначаюць, што 80-гадовая вялікая княгіня моцнай воляй арганізавала масквічоў на адпор татарам пад сценамі горада.

Памерла Соф'я Вітаўтаўна 13 ліпеня 1453 года. Пахаваная ва Узнясенскім дзявочым манастыры. Княгіня Соф'я таксама набыла некалькі вёсак, якія адпісала ўнукам. Ёй належала і падмаскоўная вёска Вараб'ёвы Горы (у савецкія гады — Ленінскія Горы), набытая ў папа па мянушцы Верабей. Гэта вёска перайшла ад яе ўнуку Івану, які стаў вялікім князем пасля смерці бацькі (праз дзевяць год пасля смерці Соф'і).

У 1469 годзе папа Павел II прапанаваў Івану руку Соф'і Палеалог, пляменніцы апошняга візантыйскага імператара. Соф'я прывезла з сабой візантыйскія паданні пра царскую ўладу і візантыйскі герб — двухгаловага арла — знак адзінства царскай і царкоўнай улады. Ідэя царства, Соф'я і двухгаловы арол натхнілі князя Івана, будучага цара Івана III Васільевіча, да далучэння новых земляў.

Па смерці Казіміра, калі літоўскі пасад заняў князь Аляксандр, цар Іван III пачаў маштабную вайну за беларускія землі.


Мастак Павел Чысцякоў (1832–1919). Карціна «Вялікая княгіня Соф'я Вітаўтаўна на вяселлі князя Васіля II Цёмнага ў 1433 годзе зрывае з князя Васіля Касога пояс, які некалі належаў Дзмітрыю Данскому»

▸ МУЗЫЧНАЯ ПАДЗЕЯ

# FINE RAMMSTEIN!

Анатоль МЯЛЬГУЙ

**Пасля легендарнага мінскага канцэрта аркестра Дзюка Элінгтона ў 1971 годзе і мінулагодняга выступу «Prodigy» на стадыёне «Дынама», канцэрт «Rammstein» займае трэцяе месца сярод топавых падзей гастрольнага жыцця краіны і першае — па колькасці слухачоў, якія наведалі канцэрт рок-зоркі ў Мінску.**



www.kp.by



У свой час для савецкай моладзі нямецкія гурты з ГДР былі своеасаблівым «вакном» у вялікі свет сусветнай рок-музыкі. Такія каманды, як «Karat», «Prinzip», «Puhdys», «Neumis Rock Circus», часцяком гастралявалі па рэспубліках СССР і знаёмілі слухачоў, зацікаўленых найноўшымі стылістычнымі рок-тэндэнцыямі, з тым, як яны ўвасабляюцца ў «жывых» канцэртных праграмах, дапамагалі асэнсаваць, якіх вяршынь могуць дасягнуць музыканты з краін «сацыялістычнага лагера».

Пасля аб'яднання Германіі нямецкі шоу-бізнес узбагаціўся за кошт таленавітых выканаўцаў ГДР, і таму сярод сусветных рок-зорак сёння мы бачым «Guano Apes», «Lacrimosa», «Tanzwut», «In Extremo», «Accept», «Udo», «Rage», «Helloween», прадстаўнікоў маладой хвалі нямецкай рок-музыкі — «Tokio Hotel», «Nevada Tan», «Cinema Bizarre»...

Але «Rammstein» у гэтай абойме займае асаблівае месца — месца галоўнага экспартнага прадукту нямецкамоўнай рок-культуры. Многія краіны свету лічаць за гонар прыняць на сваіх канцэртных пляцоўках культавых музыкантаў. Вось надышла чарга і Беларусі.

Дзякуючы дапамозе рэдакцыі «Новага Часу» мне ўдалося трапіць у лядовы палац «Мінск-Арэна» на гістарычны канцэрт «Rammstein».

## Хваляванні па дарозе да зорнага палаца

Перад тым, як упершыню выправіцца ў дарогу да «Мінск-Арэны», мне прыйшла ідэя даведацца праз інтэрнэт, якім транспартам лепш дабірацца да гэтай мінскай спартыўнай пляцоўкі, што на час пераўтварылася ў Мекку беларускіх меламанаў. На жаль, мне нічога канкрэтнага ў сусветным павуцінні знайсці не ўдалося. Давялося даверыцца інтуіцыі: на прыпынку каля ратушы разам з шматлікай кампаніяй маладых людзей зайшоў у аўтобус маршрута №1 і даверыўся лёсу. Хутка мае хваляванні адносна магчымасці не даехаць да «Мінск-Арэны» былі развеяны.

Добрым вястуном для мяне і іншых пасажыраў, якія не былі ўпэўнены ў правільнасці свайго шляху да «Rammstein», стала кандуктар аўтобуса, якая гучна абвясціла: «Не хвалюйцеся! Усе вы даедзеце да «Мінск-Арэны»! І сапраўды, праз некалькі прыпынкаў пасажыры з палёгкай убачылі гмах новага лядовага палаца і праз падземны пераход рушылі да збудавання, разглядаючы і абмяркоўваючы яго архітэктуру і грандыёзныя памеры.

## Сек'юрыці: ветлівасць і ўважлівасць

Відавочна, што вельмі цяжка падтрымліваць парадак у шматтысячным асяроддзі такой публікі, як прыхільнікі року. Але ў службы аховы ўжо ёсць вопыт працы сярод іншага неспакойнага кантынгенту — хакейных фанатаў. Ды і беларускія прыхільнікі року «Rammstein» адчувалі гістарычнасць моманту, таму збольшага праяўлялі разуменне і дэманстравалі дысцыплінаванасць у пераадольванні фармальных патрабаванняў бяспекі.

Першая з іх — працэдура ўваходу ў сектар. Дзеля гэтага трэба было прыкласці свой білет да лазернага сканера, які праз секунду даваў дазвол да далейшага руху ў напрамак да металашукальнікаў. І гэтая «перашкода» шматтысячным натоўпам прыхільнікаў «Rammstein» з поспехам пераадольвалася. Аператыўнасці спрыялі прафесіяналізм і ветлівасць супрацоўнікаў «Мінск-Арэны», якія ў гэтай важнай для слухачоў справе раўняліся на досвед сваіх нямецкіх калегаў. Далей наведвальнікаў канцэрта «Rammstein» чакалі зручныя гардэробы, кавярні і прыбіральні. А таксама імправізаваныя крамы, дзе можна было набыць адзенне з лагатыпам любімай каманды...

## Сустрэча з легендай

Канцэрт пачаўся на гадзіну пазней, чым было заяўлена ў афішах. За гэты час публіка дастаткова «разагрэлася», каб як след, на высокім эмацыянальным уздыме прыняць з'яўленне сваіх куміраў.

Напачатку публіку «разагравалі» сумесны амерыкана-нарвежскі гурт «Combichrist», які выканаў некалькі рытмічных англамоўных кампазіцый. Публіку весяліла тое, што музыканты «Combichrist» кідаліся адзін у аднаго часткамі ўдарнай устаноўкі і іншымі музычнымі прыладамі.

На гэтым «разаграваючы» сэт скончыўся, і пад гучныя воплескі і воклічы прыхільнікаў на сцэну пачалі з'яўляцца музыканты «Rammstein». Спачатку да публікі выйшаў фронтмэн «Rammstein» Тыль Ліндэман (Till Lindemann), а потым астатнія ўдзельнікі гурта — гітарысты Рыхард Круспе (Richard Zven Kruspe), Пауль Ландэрс (Paul Landers), басіст Алівер Рыдэль (Oliver Riedel), клавішнік Крысціян Лорэнц (Christian Flake Lorenz) і ўдарнік Крыстаф Шнайдэр (Christoph «Doom» Schneider). Гэтым складам музыкі адкрылі праграму свайго мінскага канцэрта, калі заспавалі песню-візітоўку «Rammstein» «Rammlied» (Песня-таран).

Сусветнавядомыя музыканты прывезлі ў Мінск новую праграму паводле апошняга скандальнага альбома «Rammstein» «Liebe ist fur alle da» — «Каханне існуе для ўсіх». Самае цікавае, што беларускім прыхільнікам ужо добра вядомыя гэтыя творы, і яны з задавальненнем спявалі разам з Тылем Ліндэманам такія кампазіцыі, як «Pussy», «Ich tu dir weh», некаторыя англамоўныя песні з гэтай кружэлкі. Выступ прайшоў на адным дыханні, імгненна, бо нямецкія музыканты маюць валадарства над часам: могуць спрасаваць, а могуць і расцягнуць яго. Адчуваецца моцны магічны пасыл музыкі «Rammstein»!

З музычнага пункту гледжання гучанне калектыву не змяняецца і застаецца сінтэзам традыцыйных маршавых рытмаў, фанетычных асаблівасцяў нямецкай мовы і ўзораў класічнай музыкі гэтай краіны. Да таго ж, «Rammstein» сёння, нават у свеце камерцыйных патрабаванняў шоу-бізнеса, застаецца адным з самых экстрэмальных па гучанню nu-metal і industrial-гуртоў сусветнай рок-сцэны. Класічным у творчасці «Rammstein» з'яўляецца і тое, што фронтмэн гурта Тыль Ліндэман выконвае песні ў экстрэмальнай стылістыцы, пры гэтым карыстаецца оперным прыёмамі.

Такія асаблівасці гучання гурта беларускія слухачы добра ведаюць па хітах «Rammstein» мінулых гадоў, якія нямецкія рок-музыканты з задавальненнем выканалі ў рэтра-частцы сваёй праграмы і на «біс». Пад высокімі крыламі «Мінск-Арэны» асабліва ўражвалі сваім гучаннем такія вядомыя кампазіцыі, як «Links 234», «Ich Will», «Benzin», «Bang Bang», «Ohne Dich», «Sonne»...

## Выбуховыя рытмы і вогненныя мелодыі

Калі распавядаеш пра канцэртныя ўражанні ад выступу такой рок-зоркі, як «Rammstein», нельга не адзначаць «фішку» гурта, якая прывабліває слухачоў з усіх кантынентаў — іх сусветнавядомае фаер-шоу. Заўважна, што для зручнасці музыкантаў яе прыстасаванні схаваны пад канцэртнай сцэнай. Гэта частка праграмы «Rammstein» — бадай самая тэхнічна ёмістая, і для транспарціроўкі абсталявання пад яе патрабуецца большая частка з дваццаці фураў, якімі карыстаецца тэхперсанал гурта.

Трэба адзначыць і тое, што «рамштайнаўскае» фаер-шоу — галоўная турбота беларускіх пажарных, якія (і гэта зразумела!) баяліся паўтору таго, што адбылося ў Расіі ў сумнавядомым клубе «Хромая лошадь». Сапраўды, беларускім пажарным давялося папрацаваць разам з нямецкімі спецыялістамі, каб агонь і выбухі петард не прынеслі шкоды слухачам, а спрыялі выключна візуальнаму ўвасабленню індустрыяльнай эстэтыкі гурта «Rammstein».

У выніку слухачы сталі сведкамі унікальнага відовішча, своеасаблівай сімфоніі з выкарыстаннем слупоў агню і пары, сцэнічных агнямётаў, кіруемых феерверкаў і моцных выбухаў, якія скаланалі палац і ўнутранасці слухачоў.

Асабліва ўражвала тое, як выбухі вялікіх петард і феерверкаў, якія на сцэне былі замаскіраваныя лялькамі з тканіны, сінхронна супадалі з сола ўдарніка «Rammstein» Крыстафа Шнайдэра. Каб надаць фаер-шоу рысы драматызму, яго рэжысёры ўводзілі ў сцэнарый шоу жывых удзельнікаў, якія бегалі па сцэне ў палаючых касцюмах, альбо «згаралі» пад уздзеяннем фантануючага вадаспада іскраў.

Але не толькі вогненнымі фокусамі было адзначана выступленне «Rammstein» у Мінску. Былі таксама і гігантскія гарматы з мыльнымі бурбалкамі і рознакаляровымі пялёсткамі, якімі музыканты прасігналізавалі слухачам пра заканчэнне канцэрта...

Можна доўга распавядаць пра тэхнічныя навінкі, якіх яшчэ не бачыў Мінск. Але не ў гэтым бачыцца важнасць гэтай культурнай падзеі. Для нашай краіны канцэрт гурта «Rammstein» сімптаматычны па некалькіх прычынах.

Па-першае, уладам урэшце ўдалося адысці ад саўковага ўяўлення пра маральнае і амаральнае ў рок-музыцы і ўстрымацца ад забароны канцэрта «Rammstein» у Беларусі. Як бы на тым не настойвалі самыя кансерватыўныя колы беларускага грамадства. Бо гэта нанесла б непапраўны ўрон аўтарытэту нашай краіны ў свеце і сярод беларускай моладзі ў прыватнасці.

Па-другое, для шматлікіх беларускіх рок-выканаўцаў канцэрт «Rammstein» — рэальнае ўвасабленне ідэі таго, што музыканты могуць дасягнуць сусветнай вядомасці і не здраджваць роднай мове, што прагрэсіўны шоу-бізнес — не перашкода для тых, каму душа баліць за лёс роднага слова ў сучаснай культуры. Ці значыць гэта, што на чарзе новыя крокі да свабоды самавыяўлення асобы — канцэрты «Metallica», «AC/DC» ды «Kiss»?

Новы Час
Масава-палітычная газета
Выдаецца з сакавіка 2002 г.
Галоўны рэдактар
Аляксей Кароль

Пасведчанне аб рэгістрацыі № 206 ад 20 ліпеня 2009.

**ЗАСНАВАЛЬНІК:** Мінская гарадская арганізацыя ГА ТБМ імя Ф.Скарыны. Адрас: 220005, г. Мінск, вул. Румянцава, 13. Тэл.: 284–85–11.

**ВЫДАВЕЦ:** Прыватнае выдавецкае унітарнае прадпрыемства «Час навінаў».

Пасведчанне №64 ад 12.01.2007 г.

**АДРАС РЭДАКЦЫІ І ВЫДАЎЦА:**
220012, г. Мінск, зав. Інструментальны, 6-214.
Тэл.: +375 29 651 21 12, +375 17 280 17 91.
novychas@gmail.com; www.novychas.org

**НАДРУКАВАНА** ў друкарні УП «Плутас-Маркет». Мінск, вул. Халмагорская, 59 А.

Замова № 219
Падпісана да друку 12.03.2010. 8.00.
Наклад 6000 асобнікаў. Кошт свабодны.

Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы дзеля палемікі, не падзяляючы пазіцыі аўтараў.
Пры выкарыстанні матэрыялаў газеты спасылка на «Новы Час» абавязковая.
Рукапісы рэдакцыя не вяртае і не рэцэнзуе мастацкія творы.
Чытацкая пошта публікуецца паводле рэдакцыйных меркаванняў.